ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 95 (4347)
ЧАЦЬВЕР, 28 красавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ — ПЕРАДАВЫ — Што паказала праверка падрыхтоўкі да сяўбы.
144 — у дзень. (2 стар.).
Зьм. ПАВАРОТНЫ, В. АЛЕКСАНДРОВІЧ — «Кропка з хвосьцікам». (3 стар.).
БІБЛІЯГРАФІЯ — Аб ролі пастуха. (4 стар.).
Забясьпечыць поўнае выкананьне пасеўных плянаў аднаасобным сэктарам. (1 стар.).
Бярэзінскі хэмкамбінат уступіў у строй. (1 стар.).
IX ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ — На чале мас да новых рэвалюцыйных баёў. (2 стар.).
Не перавышаць лімітаў. (2 стар.).
Лёзунгі да 1 мая 1932 году. (2 стар.).
Надзвычайнаму раённаму зьезду саветаў Койданаўшчыны—бальшавіцкае прывітаньне. (3 стар.).
ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б — Аб разгортваньні самазагатовак. (3 стар.).
Аб скажэньні савецкага дробнага гандлю каапэрацыйна-гандлёвымі арганізацыямі. (3 стар.).
Падпальшчыкі вайны ўзмацняюць праваканарскую работу на КУЧ. (4 стар.).

ШТО ПАКАЗАЛА ПРАВЕРКА ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ

Генэральная праверка падрыхтаванасьці да сяўбы скончана. У нашым распараджэньні яшчэ няма поўных даных, якія-б дазволілі падагуліць праведзеную па ўсёй БССР работу. Але і атрыманых матар'ялаў даволі, каб канстатаваць вялікарнае палітычнае і гаспадарчае значэньне гэтага масавага мерапрыемства.

Факты наглядна гавораць, што там, дзе ў рух былі прыведзены армія рабселькораў, шырокія пласты калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і аднаасобнікаў бедняцкой і серадняцкой, дзе ўся партыйная і савецкая грамадзкасьць была сапраўды ўзьнята на ногі, генэральная праверка дала выключныя рэзультаты.

У такіх мясцох усе пяжкасьці на шляху падрыхтоўкі да сяўбы, якія здаваліся апартуністычным элементам непераможнымі, былі хутка пераадоланы і мерапрыемствы партыі і ўраду поўнасьцю выкананы. Шматлікія факты пацьвярджаюць гэта з усёй пэўнасьцю.

Прыкладам можа служыць Бацьвінаўскі сельсавет, Крычаўскага раёну. Дзякуючы наладжанай самаправерцы, да непасрэднага і актыўнага ўдзелу ў якой былі прыцягнуты калгасьнікі і аднаасобнікі, калгасы і вёскі гэтага сельсавету хутка выступілі ў рады перадавікоў трэцяй бальшавіцкай вясны. У адказ на пасыпаньні і кулацкія вылазкі, на выцьцё апартуністаў, бацьвінаўцы па-баявому ўзяліся за выпраўленьне недахопаў у падрыхтоўцы да сяўбы. Яны ўжывалі выпрабаваныя мэтады барацьбы і выйшлі пераможцамі.

Арганізаваўшы насенную ўзаемадапамогу, калгасы і аднаасобнікі Бацьвінаўскага сельсавету мабілізавалі патрэбную ім колькасьць насеньня. Правялі акцыцыдаваньні дырэктывы партыі аб пастаянных вытворчых брыгадах і выканаўшы рад агранамічных мерапрыемстваў, бацьвінаўцы калгасы забясьпечылі праведзень по раньняй сяўбы і павышэньне ўраджайнасьці. Аказваючы практычную і арганізацыйную дапамогу, разгортваючы масавую работу, калгасы гэтага сельсавету здолелі павесьці за сабой аднаасобны сэктар і забясьпечыць выкананьне ім вызначаных пасеўных плянаў.

Генэральная масавая праверка дала магчымасьць скарыстаць унутраныя насенныя рэсурсы, выявіць якія ня сёлелі, або не жадалі асобныя арганізацыі і работнікі на мясцох. Робячы стаўку на завоз насеньня звонку, яны праходзілі міма імкненьняў клясавага ворага сарваць сяўбу шляхам распальваньня спакыпецкіх тэндэнцый сярод калгасьнікаў. Характэрнымі ў гэтых адносінах зьяўляюцца факты з Чэрыкаўскага раёну, які між іншым скардзіўся на недахват насеньня і асабліва бульбы. Праверка адразу ўстанавіла, што ў сапраўднасьці насеньня, у тым ліку і бульбы ў гэтым раёне ёсьць у выстарчальнай колькасьці. Але разам з гэтым выявілася, што з асобных сельсаветаў Чэрыкаўшчыны наўмысьля давалі ня правільныя весткі аб сэмпцы насеньня. Мэта і задачы такога роду злачынных дзеяньняў агентуры клясавага ворага ясны і зразумелы.

Трэба адзначыць падрэсьліць, што ў шэльм рэдзе раёнаў і сельсаветаў падрыхтоўкі да генэральнай праверкі чыста фармальна, не зразумелі яе палітычнай сутнасьці.

У Ельскім раёне зусім абышлі праверкай аднаасобны сэктар. Між тым у радзе сельсаветаў гэтага раёну аднаасобнікам — бедняком і серадняком яшчэ не адведзен яравы клін.

Ігнараваньне праверкі падрыхтоўкі аднаасобніка да сяўбы было ўласьціва многім раёнам і сельсаветам і павінна быць адзначана, як адзін з асноўных недахопаў у правядзеньні генэральнай праверкі.

Тыя паказальнікі падрыхтоўкі да вясны, якія ёсьць па сёньняшні дзень, ня могуць нас задаволіць ні ў якой меры.

Да гэтага часу ўсё яшчэ ня скончана мабілізацыя насеньня. На 20-га красавіка БССР выканала толькі 74,3 процантаў плану. Недапушчальна адстае ссыпка тэхнічных культур — заданьне выканана ўсяго на 51 проц., а групай вядучых ільнаводчых раёнаў і таго менш — па 45,4 проц. На мёртвым пункце ссыпка страхавых фондаў — 37,8 проц., а па тэхнічных культурах—22,2 проц.

Яшчэ горш малюнак па аднаасобным сэктары, які ссыпаў страхавых фондаў 14,3 порц., а па тэхнічных — 9,2 проц.

Ня скончан і рамонт машын і інвэнтару. Плян рамонту трактараў, напрыклад, выкананы па 88 проц., конных плугоў — 74,7 проц., сяўбарак — на 86,2 проц., калёс — на 63,3 проц. І тут аднаасобнік вельмі адстае. Аднаасобны сэктар даў усяго 61,9 порц. выкананьня заданьня па рамонце плугоў і 51,3 проц. —па рамонце калёс.

Зусім нездавальняючым трэба прызнаць ход арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад, г. з. важнейшага мерапрыемства ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Даволі сказаць, што па 10 красавіка ў 9.686 калгасах было арганізавана, паводле даных НКЗ, усяго 7.303 брыгады. Калі ўлічыць, што ў кожным калгасе павінна быць створана па некалькі паляводных брыгад (ня лічачы ўжо іншых спэцыялізаваных), дык стане зразумела, што ў значнай частцы калгасаў яшчэ нічога ня зроблена ў галіне перабудовы ўсёй работы па-новаму. Гэта вынік грубейшай палітычнай недаацэнкі радам раённых і вёзавых арганізацый дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пастаянных вытворчых брыгадах, якія закліканы забясьпечыць правядзеньне рашэньняў сяўбы і высокі ўраджай. Вось некалькі яркіх ілюстрацый. У Жлобінскім раёне на 118 калгасаў створаны 42 брыгады, у Клічаўскім — аднаведна 122 і 69, у Чачэрскім 42 і 27, у Брагінскім — 87 і 40, у Лоеўскім — 86 і 23, у Хойніцкім — 81 і 8 і г. д.

Праверка выявіла за многіх мясцох грубейшыя скажэньні ў арганізацыі вытворчых брыгад. Гэтыя скажэньні ў асноўным зводзяцца: да арганізацыі брыгад намінальна па вытворчым прынцыпе, а фактычна зноў па тэрытарыяльным (брыгады - дворкі , брыгады-аддзяленьні) ; стварэньне розных брыгад аратых, барановаўшчыкаў, касцоў і г. д. ; разьбіўкі калгасьнікаў па вельмі шматлікія брыгады.

Скончаньне генэральнай праверкі супадае з разгортваньнем сяўбы па ўсёй БССР. Наркамзем БССР устанавіў тэрміны скончаньня сяўбы раньніх яравых (10 дзён) для паўднёвых раёнаў — 8 мая, цэнтральных — 12 мая і паўночных — 18 мая. Але вясна наступіла сёлета раней, чым яе чакалі, а вегетацыйныя ўмовы спрыяюць палявым работам. У сувязі з гэтым перад усімі раёнамі стаіць задача — скончыць сяўбу яравых да тэрміну, вызначанага НКЗ. Гэта задача можа і павінна быць выкананая. Раньняя сяўба яравых абожжавых дазволіць скараціць тэрміны сяўбы тэхнічных культур (тэрмінны сяўбы тэхнічных культур: для паўднёвых — 15 мая , для цэнтральных — 20-га, для паўночных — 25-га), бульбы і кармовых (для паўднёвых — 15 мая, для цэнтральных і паўночных раёнаў —20-га), зьяўляцца адным з лепшых спосабаў барацьбы за высокі ўраджай.

Незавяршэньне падрыхтоўкі да вясны да моманту разгортваньня сяўбы высоўвае неабходнасьць на-ходу, ударнымі тэмпамі падцягваць адстаючыя вучасткі, адначасова разгортваючы масавую сяўбу.

Жорсткая барацьба з кулаком і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі, бальшавіцкая настойлівасьць ажыцьцяўленьня тых ці іншых мерапрыемстваў, выразнае і сапраўды анэрацыйнае кіраўніцтва, мабілізацыя саміх шырокіх мас калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і аднаасобнікаў на выкананьне плянаў—вось ключы да рашаючай перамогі.

Трэба зараз ухапіцца за асноўныя зьвенні, каб выцягнуць увесь ланцуг. Гэтымі асноўнымі зьвеньнямі ў сучасных умовах зьяўляюцца: пасеў не, арганізацыя працы і якасьць работы. Іменна ў гэты бок павінна быць накіравана ўвага ўсіх нашых цэнтральных, раённых і вёзавых арганізацый. Аб тым, што ад пасьпяховай барацьбы на гэтых вучастках залежыць перамога, гаворыць вопыт ударнікаў сацыялістычных палёў Крыму і практыка першых дзён сяўбы нашых перадавых калгасаў (напрыклад, арцелі «Чырвоная Бярэзіна», Бабруйскага раёну і інш.). Неабходна фарсаваць скончаньне кантрактацыі яравых.

Трэба ня згортваць, а максымальна фарсаваць работу па мабілізацыі насеньня, асабліва **тэхкультур і траў** рэалізуючы ўнутраныя, улаасныя рэсурсы. Шляхам арганізацыі ўзаемнай пасеннай дапамогі калгасьнікаў і аднаасобнікаў можна і трэба ў бліжэйшыя-ж дні поўнасьцю забясьпечыць патрэбным пасеньнем усю пасеўную плошчу.

Далейшае ігнараваньне катэгарычных дырэктыў аб вытворчых брыгадах ня можа быць цярпіма. Бяз правільнай арганізацыі калгаснай працы па аснове пастаноў ЦК УсеКП(б) ад 4 красавіка і ЦК КП(б)Б ад 26-III нельга забясьпечыць перамогу калгасаў на фронце трэцяй бальшавіцкай вясны.

Неабходна так расставіць партыйныя і камсамольскія сілы, каб забясьпечыць арганізуючы ўплыў партыі ў брыгадзе, групе. Абавязак кожнага члена калгаснай брыгады — партыйца і камсамольца—сваім асабістым прыкладам паказваць узор ударнай работы, узор барацьбы за неправыкананьне штодзённых заданьняў, за поўнае ўжываньне ўсіх агратэхнічных правіл.

Грунтуючыся на практыцы ўзаемадапамогі калгасаў і аднаасобнікаў у пэрыяд падрыхтоўкі да вясны, трэба ўсяляк гэту практыку распаўсюджваць у часе разгортваньня масавай сяўбы. Прыклады ўзаемадапамогі даволі рознастайныя. Тут і агратэхнічная дапамога, дапамога людзкой сілай, машынамі і інвэнтаром і г. д. Арганізуючы ўзаемадапамогу, калгасы і саўгасы будуць змагацца за скарочаны тэрмін сяўбы і адначасова забясьпечыць поўнае колькаснае і якаснае выкананьне пасеўных плянаў аднаасобным сэктарам.

Усе гэтыя асноўныя ў даны момант задачы могуць быць выкананы на аснове шырока-разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцкага руху, якім павінна быць прасякнута работа кожнага саўгасу, калгасу, кожнай вёскі. Не павінна быць ні аднэй калгаснай брыгады, ні аднаго калгасьніка, які ня быў-бы ахоплен сацыялістычным спаборніцтвам.

Барацьбу з кулаком, які ўсялякімі манэрамі імкнецца сарваць сяўбу, трэба ўзмацніць у шмат разоў. Самы скорсткі адпор — праяўленьням праваапартуністычнай практыкі, «лявацкім» загібам і адміністраваньню! Асаблівую увагу неабходна зьвярнуць на барацьбу з парушэньнямі статуту с.-т. арцелі, з ігнараваньнем **аднаасобніка.**

Генэральная праверка падрыхтаванасьці да сяўбы скончана. Але гэта зусім не азначае аслабленьня нашай увагі і барацьбы на фронце веснавой сяўбы. Наадварот, барацьба пад кіраўніцтвам партыі працягваецца і будзе працягвацца з патроенай энэргіяй, за поўную перамогу на фронце змаганьня за высокі сацыялістычны ўраджай.

Забясьпечыць поўнае выкананьне пасеўных плянаў аднаасобным сэктарам

ШЫРОКАЯ МАСАВАЯ РАБОТА, УЗАЕМАДАПАМОГА КАЛГАСАЎ І АДНААСОБНІКАЎ, СВАЯЧАСОВЫ АДВОД ЯРАВОГА КЛІНУ—

ЛЕПШЫЯ СРОДКІ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЕРАМОГУ НА ГЭТЫМ ВУЧАСТКУ ПАСЕУНАГА ФРОНТУ

„Навошта нам ведаць, як падрыхтаваны аднаасобнікі да сяўбы"

КАРМА.

Аднаасобны сэктар у Кармянскім раёне складае большасьць—54 проц. Падрыхтоўка да сяўбы ўвесь час праходзіла самацёкам. Нізавыя і раённыя арганізацыі не займаліся пытаньнем падрыхтоўкі да сяўбы па аднаасобным сэктары. У выніку гэтай недаацэнкі, сяўбу аднаасобнікі сустракаюць яшчэ непадрыхтаванымі.

Загадчык райза Сахарэвіч разважае:

— Навошта нам ведаць, як ідзе засыпка насеньня ў аднаасобнікаў, мы нават з калгасаў ня можам сабраць дакладныя весткі.

У радзе сельсаветаў аднаасобнікі яшчэ нават ня ведаюць дзе ім прыдзецца сеяць (Бамятнянскі сельсавет), не праведзена вялікаўпадказваньне.

У Журавіцкім і Ворнаўскім сельсаветах праяўлена праваапартуністычная практыка ў давядзеньні пасеўных плянаў. У гэтых сельсаветах на ўсім кулацка-заможным гаспадаркам даны цвёрдыя заданьні па засеве.

Аднаасоба адной серадняцкай гаспадарцы сельсаветчыкі давялі заданьне (не ў парадку самаабвязацельства) па засеве яўса—1,125 га; ячменю—0,738 га; бульбы—0,846 га; вікі — 0,0033 га; па сіласных культурах — 0,0028 га; па гародных культурах — 0,00048 га і г. д.

Такія пляны даводзіліся не адной гаспадарцы, а амаль усім бядняцка-серадняцкім гаспадаркам сельсавету.

Тысячныя, дзесяцітысячныя і стотысячныя лічбы ворнаўскіх апартуністаў ёсьць нішто іншае, як блытаніна, накіраваная на зрыў веснавой сяўбы па аднаасобным сэктары. Гэтых лічбаў не разумеюць ня толькі аднаасобнікі, а нават і самі сельсаветчыкі. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі і зараз ня ведаюць, колькі і чаго ім патрэбна сеяць. Сельсавет і некаторыя партыйна-камсамольскія ячэйкі не раз гарнулі масава-растлумачальнай работы сярод аднасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вакол падрыхтоўкі да сяўбы.

Раённыя арганізацыі на працягу ўсёй падрыхтоўкі не аддавалі неабходнай увагі аднаасобнаму сэктару. 1 толькі 16 красавіка пленум РК КП(б)Б рашуча скарыгадзіў партыйныя ячэйкі сельсавету і праўленьні калгасаў аб неабходнасьці ўзмацненьня масавай работы сярод аднаасобнікаў па падрыхтоўцы да сяўбы. **Т. Цаўко.**

Ціхініцкі і М.-Стралкоўскі с. с. не вядуць работы сярод аднаасобнікаў

РАГАЧОЎ, 25 (БелТА). Аднаасобны сэктар Рагачоўшчыны сяўбу сустрэў далёка непадрыхтаваным. Плян засыпкі страхавых фондаў стаіць пад пагрозай зрыву. На 23 красавіка страхавыя фонды па аднаасобным сэктары па збожжавых культурах створаны толькі на 21 проц. пляну. Замест патрэбных 3268 цэн. засыпана толькі 695 цэн. Страхавыя фонды па тэхкультурах ссыпаны на 51,5 проц.

Паасобныя сельсаветы, парт'ячэйкі і КСУ недаацэньваюць аднаасобны сэктар, ня гледзячы на тое, што ўдзельная вага апошняга ў веснавой сяўбе г. т. на раёне складае каля 70 проц.

У Мала-Стралкоўскім сельсавеце страхавыя фонды ў аднаасобнікаў ссыпаны толькі па 20 проц. Сельсавет і парт'ячэйка не вядуць ніякай масава-растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкага сялянства для хутчэйшага выкананьня пляну засыпкі страхфонду. Маластралкоўскае КСУ таксама стаіць у баку ад гэтай работы. У сельсавеце ёсьць вялікая запазычанасьць насеньня за мінулы год. КСУ гэтай запазычанасьці не спагнае.

Па аднаасобным сэктары Ціхініцкага сельсавету павінна быць засыпана 160 пудоў страхфондаў. Але па сёньняшні дзень не засыпана ні аднаго кілё. Старшыня КСУ Важанкоў у падрыхтоўцы да сяўбы (засыпка страхфонду, спагнаньне леташніх пазык і г. д.) абсалютна нічога ня робіць.



НА ЗДЫМКУ: сяўба раньніх яравых.

Калгасы Любаньшчыны і аднаасобнікі арганізуюць працоўную ўзаемадапамогу

ЛЮБАНЬ. Для хутчэйшага скончаньня веснавой сяўбы па Асавецкім сельсавеце шырока разгорнута ўзаемадапамога паміж калгасамі і аднаасобным сэктарам як інвэнтаром, таксама і рабочай сілай.

Так, калгасьнікі і аднаасобнікі вёскі Зялёнкі 18 красавіка арганізавалі суботнік для ворыва плошчы пад яравы клін і вывазку гною калгасу «Чырвоны барацьбіт».

ЧОРНЫ.

СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ РАНЬНІХ ЯРАВЫХ

ХОЙНІКІ. (Па тэлеграфу). У выніку добрай падрыхтоўкі да вясны і ўдарных тэмпаў работы паляводных брыгад, калгас «ЧЫРВОНЫ БОР» скончыў сяўбу збожжавых культур. Засеяна яравога жыта — 20 гэкт., аўса — 18 гэкт., ячменю — 6, гароху — 2 гэкт.

***

КАМАРЫНА. (Па тэлеграфу). Калгас **«Дняпроўскі араты»** скончыў сяўбу збожжавых.

Апошнія весткі з пасеўнага фронту Саўгасы БССР пачалі масавую сяўбу

На 20-га красавіка засеяна саўгасамі Белмалпрамтрэсту 247 га розных культур, і кармовай капюшыны — 105 га.

Упераздзе ідзе саўгас **«Завалоцічы»** (Глускі раён), які засеяў 51 га.

Прыступілі да палявых работ таксама 8 саўгасаў Насентрэсту — засеялі 117 га.

***

НАРОЎЛЯ. (Па тэлеграфу). На параўляскім раёне засеяна 539 га раньніх яравых культур: калгасамі — 346 га, аднаасобнікамі — 193 га.

ШАБАНАЎ.

***

ГЛУСК. (Па тэлеграфу). На 25 красавіка ў Глускім раёне засеяна 1.786 га.

Узоры барацьбы за раньнюю сяўбу паказвае Клетнянскі сельсавет, які ўжо засеяў 331 га розных культур.

ЦЫПІНА.

Пасеўная зводка НКЗБ **№ 2** *на 25 красавіка*

РАЁНЫ	Засеяна ўсяго ў гэкт.	У тым ліку: У калгасах	У аднаасоб.	Пад пакроўнымі
Койданаўскі	140	140	—	8
Вузьдзенскі	349	313	36	
Капыльскі	219	213	6	35
Пропойскі	398	391	7	10
Брагінскі	643	474	169	
Веткаўскі	12	12	—	
Жыткаўскі	637	542	95	2
Бешанковіцкі				30
Заслаўскі	14	14	—	25
Лоеўскі	451	245	206	3
Хойніцкі	637	316	321	
Пятрыкоўскі	716	473	243	240
Чырвонапольскі	103	103	—	24
Любаньскі	344	175	169	
Клічаўскі	115	88	27	
Чачэрскі	42	17	25	
Сяўцкі	83	83	—	
Ратачоўскі	16	12	4	
Парыцкі	3682	1571	2111	
Ст.-Дарожскі	40	31	9	
Гомельскі	61	61	—	
Нараўлянскі	539	346	193	3
Жлобінскі	557	243	315	
Лельчыцкі	710	339	371	
Ельскі	299	214	85	9
Глускі	90	11	79	
Мазырскі	2075	960	1115	
Крычаўскі	67	67	—	141
Кармянскі	30	30	—	
Дрысенскі				110
Чавускі				217
Клімавіцкі	106	106	—	33
Старобінскі	46	41	5	20
Асіповіцкі	122	54	68	14
Аршанскі	10	10	—	280
Уваравіцкі	9	9	—	—
Горацкі	4	4	—	30
Усяго па 37 раёнах:	13366	7708	5658	1239

УВАГА: Апрача гэтага засеяна саўгасамі 747 га і падпакроўнымі 258 га. Усяго па БССР засеяна 14.113 і падпакроўнымі 1.497 га.

Зводка складзена на 25 красавіка па 28 раёнах, астатнімі 9 раёнамі весткі ўключаны на 20 красавіка 1932 г.

Кіраўнік пасеўбюро — **Тарасевіч.**

Зямля не адведзена, дзе сеяць?

СЛУЦАК, 25. У радзе сельсаветаў сяўба ў аднаасобным сэктары знаходзіцца пад пагрозай зрыву. У вёсках Лучнікоўскага і Кастрычніцкага сельсаветаў, дзе былі арганізаваны новыя калгасы, аднаасобнікам не адведзена зямля. Сельсаветы і парт'ячэйкі апартуністычна недаацэньваюць аднаасобны сэктар. КСУ бязьдзейнічаюць.

У Лучнікоўскім сельсавеце страхавыя фонды ў аднаасобным сэктары ня створаны. Насеньне адышчана толькі ў паасобных гаспадарках. Дрэнна з рамонтам сельска-гаспадарчага інвэнтару. Такое-ж становішча ў Кастрычніцкім сельсавеце. Пляны сяўбы ў аднаасобным сэктары скарочаны, ды і тыя не даведзены да двара, у парадку самаабвязацельстваў, а ляжаць у сельсавеце. **Б.**

Пра ход падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) ня гледзячы на тое, што раёны паўднёвай і сярэдняй часткі БССР ужо пачалі сяўбу, падрыхтоўка да яе ў радзе раёнаў праведзена нездавальняюча, асабліва нездавальняюча ідзе засыпка пасенных і страхавых фондаў тэхнічных культур (лён і канопілі) і траў; яшчэ да гэтага часу рад раённых арганізацый замест бальшавіцкай барацьбы за стварэньне пасенных фондаў толькі і займаюцца тым, што зварачаюцца ў цэнтр за пасеннай дапамогай;

б) рад раённых арганізацый недаацэньваюць значэньня арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у справе правядзеньня веснавой сяўбы: зьдзельшчына ўведзена толькі ў 65 проц. калгасаў, нездавальняюча ідзе арганізацыя брыгад;

в) барацьба за ўкараненьне агратэхнікі ў сельска-гаспадарчую вытворчасьць, за ўздым ураджайнасьці праводзіцца слаба, у выніку чаго плян збору попелу выкананы па 48 проц., вывазка вапны па 8 проц. гадовага пляну, вывазка гною на 12 проц., ачыстка насеньня на 57 проц.;

г) падрыхтоўка да правядзеньня сяўбы ў садова-гародных гаспадарках пастаўлена нездавальняюча (закладка парніковых рам выканана па 57 проц.), што ставіць пад пагрозу зрыў пасеву раньніх гародных культур і рабочае забесьпячэньне;

д) кантрактацыя пасеваў і пасаджэньняў усё яшчэ не разгорнута (выканана на 15-IV-32 г. па 11 проц.), што асабліва зьяўляецца недапушчальным. Рад раённых і цэнтральных арганізацый не мабілізавалі актыўнасьці і самадзейнасьці калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства пры правядзеньні кантрактацыйнай кампаніі для выкананьня пляну сяўбы.

Выходзячы з гэтага, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, народны камісарыят зямляробства, Белкалгасцэнтр, цэнтральнымі задачамі па падрыхтоўцы і правядзеньні сяўбы паставіць.

а) далейшую барацьбу за стварэньне пасенных і страхавых фондаў, асабліва тэхнічных культур (лён, канопілі), траў і бульбы;

б) арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў на падставе сапраўднай зьдзельшчыны і вылучэньня брыгад, а таксама масавы выхад у поле калгасаў і аднаасобнікаў;

в) правядзеньне кантрактацыі і скарыстаньне яе для мабілізацыі актыўнасьці і самадзейнасьці калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства па поўным выкананьні вызначаных пляноў сяўбы;

г) укараненьне агратэхнікі ў сельска-гаспадарчую вытворчасьць (скарыстаньне мясцовых відаў угнаеньня і апрацоўкі глебы і пасеваў у вызначаныя тэрміны).

2. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты пад пэрсанальную адказнасьць старшынь забясьпечыць скончэньне засыпкі пасенных і страхавых фондаў. асабліва ільну, канапель, траў і бульбы, скончыўшы яе да 10 мая ў разьмерах, якія забясьпечваюць поўнае выкананьне пляну.

3. Прапанаваць пэрсанальна старшыням Барысаўскага, Буда-Кашелеўскага, Бярэзінскага, Веткаўскага, Жлобінскага, Кармянскага, Касьцюковіцкага, Клімавіцкага, Клічаўскага, Крычаўскага, Рагачоўскага, Уваравіцкага, Чачэрскага, Чырвонапольскага, Чэрвеньскага, Чэрыкаўскага, Аршанскага, Віцебскага, Менскага, Бялыніцкага, Лёзьнянскага, Сураскага раённых выканаўчых камітэтаў, апрача выкананьня пляну засыпкі і загатоўкі насеньня ільну і канапель для забесьпячэньня раённых патрэб, забясьпечыць насенную дапамогу ільнаводчым раёнам па нарадах народнага камісарыяту зямляробства.

4. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, беларускую кантору Саюзпасенаводу і беларускую кантору «Заготлён» узмацніць адгрузку насеньня, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на загатоўку насеньня тэхкультур, лубіну, сэрадэлы і шматгадовых траў, накіраваўшы ў асноўныя раёны загатовак аднаведную колькасьць працаўнікоў.

5. Даручыць Белкалгасцэнтру і раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць масавы выхад у поле калгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, скончыўшы працу па арганізацыі брыгад у калгасах, для чаго камандыраваць у найбольш адстаючыя калгасы раённых працаўнікоў.

6. Ня гледзячы на неаднаразовыя папярэджаньні з боку Савету Народных Камісараў, яшчэ і да гэтага часу рад раёнаў парушаюць статут сельска-гаспадарчай арцелі. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і Белкалгасцэнтру праверыць выпадкі парушэньня статуту сельска-гаспадарчай арцелі і максымальна па папулярызаць статут, мабілізуючы на гэтай падставе калгасьнікаў на далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

У сувязі з тым, што ў радзе раёнаў (Смалявіцкім, Сіроцінскім і Клімавіцкім) дапускаецца адміністраваньне, грубае парушэньне адпаведных пунктаў статуту сельска-гаспадарчай арцелі ў справе карыстаньня калгасьнікамі прысядзібнымі вучасткамі, даручыць паказаным раённым выканаўчым камітэтам неадкладна скасаваць свае пастановы, якія парушаюць статут сельска-гаспадарчай арцелі, папярэдзіўшы іншыя раённыя выканаўчыя камітэты аб суровай адказнасьці за дапушчэньне адміністраваньня, якое падрывае справу калектывізацыі.

7. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і Народны Камісарыят Зямляробства забясьпечыць да 1 мая зямляпаказаньне калгасам і бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

8. Абавязаць саўгастрэсты, Белкалгасцэнтр і Белкаапсаюз забясьпечыць разгортваньне работы па грамадзкім харчаваньні ў саўгасах і найбольш буйных калгасах.

Даручыць камісіі выкананьня пры СНК БССР праз дэкаду выслухаць даклады саўгастрэстаў, Белкалгасцэнтру і Белкаапсаюзу аб арганізацыі грамадзкага харчаваньня.

9. Абавязаць упаўнаважанага камітэту па загатоўках праверыць работу ўсіх цэнтральных арганізацый, якія праводзяць кантрактацыю.

Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць правядзеньне кантрактацыі ва ўстаноўленым эканамічным Саветам тэрміны, мабілізаваўшы вакол кантрактацыі шырокія колы калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы.

10. Ухваліць мерапрыемствы Народнага Камісарыяту Зямляробства аб пераводзе ўсіх майстэрань капітальнага і сярэдняга рамонту на работу круглы год і прымацаваньні да іх машына-трактарнага парку. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць сыстаматычны нагляд за работай майстэрань.

11. Пастаноўка ўліку аб ходзе пасеўнай кампаніі зьяўляецца адной з важнейшых задач зямельных і калгасных органаў і раённых выканаўчых камітэтаў. Маючы на ўвазе, што ў мінулым годзе некаторыя раённыя арганізацыі пры дачы вестак аб правядзеньні сяўбы дапусьцілі яўнае «очковтирательство», абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, саўгастрэсты, і дырэктароў саўгасаў, сельскія саветы і раённыя калгассаюзы забясьпечыць дакладны ўлік ходу сяўбы і падаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства ва ўстаноўленыя тэрміны дакладна праверяныя весткі. За правільнасьць вестак адказваюць старшыні раённых калгассаюзаў, загадчыкі зямельных аддзелаў, дырэктары саўгасаў і старшыні раённых выканаўчых камітэтаў.

12. Выходзячы з таго, што вопыт паказаў мэтазгоднасьць квадратнага (маркернага) пасеву бульбы і што ўжываньне гэтага спосабу значна павялічвае ўраджайнасьць бульбы, прапанаваць Белкалгасцэнтру і саўгастрэстам шырэй і больш рашуча практыкаваць гэтыя мэтады пасадкі бульбы ў бягучую пасеўную кампанію, а раённым выканаўчым камітэтам рабіць усебаковую дапамогу калгасам і саўгасам пры ўжываньні гэтага спосабу.

13. Лічыць патрэбным, каб цэнтральны і раённы друк найбольш поўна асьвятлялі ход засыпкі пасенных і страхавых фондаў, асабліва тэхнічных культур і траў, загатоўку насеньня і ход сяўбы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР—М. ГАЛАДЗЕД.
25 красавіка 1932 г.
г. Менск.

БЯРЭЗЬНІКАЎСКІ ХЭМКАМБІНАТ УСТУПАЕ Ў СТРОЙ

ЦК УсеКП(б) т. Сталіну, Саўнаркому СССР т. Молатаву, Наркамцяжпраму СССР т. Арджанікідзэ, Цэнтральнаму органу УсеКП(б)—„Правде"

РАПАРТ

Баявое сьвята міжнароднага пралетарыяту — 1 мая — мы сустракаем уводам у строй гіганта сацыялістычнай індустрыі — Беразьнікоўскага хэмкамбінату.

Камбінат, — гаворыцца ў рапарце, ужо даў краіне першыя тысячы тон серкавай кіслаты. 23 красавіка атрыман першы аміяк. Першая калёнка сынтэзу ў першы-ж дзень работы заводу дасягнула вырабу ў разьмерах 90 проц. праектнай магутнасьці.

Контр - рэвалюцыйныя шкоднікі ўяўлялі сабе вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне камбінату, калі яны ўсяляк аддягвалі будоўлю, калі яны блыталі праекты, ускладняючы і паглыбляючы і без таго значныя труднасьці, якія стаяць на шляху будаўніцтва новых савецкіх хэмічных прадпрыемстваў. Пуск камбінату — сьвята ўсёй савецкай краіны, сьвята ленінскай палітыкі ЦК. Пуск камбінату — вялізарны ўклад у справу індустрыялізацыі СССР, умацаваньня эканамічнай незалежнасьці краіны, узмацненьня яе абароназдольнасьці.

Начальнік будаўніцтва Беразьнікоўскага хэмкамбінату ГРАНОЎСКІ.

Сакратар Бярэзьнікоўскага РК УсеКП(б) ШАХ-ГІЛЬДЗЯН.

Старшыня РК хэмікаў БАЦКАЛЕВІЧ.

Дняпро стаў судаходным

24 красавіка раніцой з Днепрабуду адправілася парогамі ўверх па Дняпры экспэдыцыя з Днепрапятроўску. Экспэдыцыя прайшла бліскуча. На месцы парогаў — шырокі Дняпро. Ударнікі Днепрабуду, якія заваявалі Дняпро, першыя адкрылі рэйсы па затопленых парогах. З Кічкасу да Днепрапятроўску ішлі 11 гадзін.

28 красавіка з Днепрапятроўску выйдзе па Днепрабуд першы параход «Сялянка».

ПУШЧАН ДРУГІ ТУРБАГЕНЭРАТАР НА ДНЯПРОЎСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

КІЧКАС, 25. Учора ўдзень пушчан другі турбагенэратар Дняпроўскай электрастанцыі. Сёньня яго ставяць на прасушку. Мантажнікі змагаюцца за фарсаваны пуск трэцяй турбіны. Мантаж яе скончан. Пуск турбіны назначан на 28 красавіка.

Скончана будаўніцтва чалябінскага кіслароднага заводу

ЧАЛЯБІНСК, 25. Будаўніцтва

IX зьезд прафсаюзаў

На чале мас да новых рэвалюцыйных баёў

Даклад тав. Лазоўскага)*

Са справаздачным дакладам делегацыі УсеЦСПС у Прафінтэрне выступіў **тав. Лазоўскі**, сустрэчаны працяжнымі воплескамі.

— Вопыт работы савецкіх прафсаюзаў як за мінулы час, так і за сёнешні дзень,—пачаў тав. **Лазоўскі**,—з вялізарнейшай увагай успрымаецца рэвалюцыйным прафрухам ва ўсіх краінах.

Канец стабілізацыі капіталізму

Яшчэ ў 1925 г., калі капіталістычны свет уступаў у перыяд адноснай стабілізацыі, тав. Сталін даў ацэнку, якая зараз поўнасцю апраўдалася. «Мы маем, такім чынам,—гаворыць **т. Сталін**,—здвое стабілізацыі. На адным полюсе стабілізуецца капіталізм, замацоўваючы дасягнутае становішча і разыгрываючыся далей. На другім полюсе стабілізуецца савецкі лад, замацоўваючы за сабой завяваныя пазыцыі і прасоўваючыся наперад па шляху да перамогі».

«Стабілізацыя капіталізму, — кажа тав. **Сталін**,—ня можа быць моцнай, гэта стабілізацыя азначае нарадженьне ўмоў, якія вядуць да пароджэньня капіталізму» (там-жа стар. 114). Такім чынам, тав. **Сталін** яшчэ ў 1925 годзе ўказваў на немоцнасьць стабілізацыі капіталізму, і мы бачым зараз бліскучае пацьвярджэньне гэтаму: у 1928 годзе капіталізм дасягнуў вышэйшага пункту сваёй адноснай стабілізацыі, а ў 1929 годзе наступіў грандыёзны эканамічны крызіс.

Калі мы запытаем сябе, у чым была аснова правага ўхілу ў Камінтэрне, Прафінтэрне і ў радах УсеКП(б), дык яна, безумоўна, была ў перакананасьці моцнасьці капіталізму. Калі сапраўды ў некаторых краінах адбывалася пэўная рэканструкцыя некаторых галін гаспадаркі ва кошт рабочай клясы, дык гэта зусім не азначала рэканструкцыі самога капіталізму. Іменна перыяд капіталістычнай рацыяналізацыі і рэканструкцыйны перыяд у СССР выявілі асабліва чрэзвычайна паўстойлівы характар стабілізацыі капіталізму, што не магло ня прывесьці да ўзрыву гэтай стабілізацыі.

Пабываўшы эканамічны крызіс, які патрасае ўжо трэці год увесь капіталістычны свет, падрыў вэрсальскай сыстэмы, пачатая вайна на Далёкім Усходзе і барацьба за перадзел калёній поўнасьцю пацьвярджаюць устаноўкі VI кангрэсу Камінтэрну, які падкрэсьліў абвостраныя супярэчнасьці капіталізму і нямінучасьць новых перагрупаваньняў, новай паласы войнаў і новых задач для міжнароднага пралетарыяту. Апісываючы ўсю сусьветную абстаноўку, можна сказаць, што **прышоў канец капіталістычнай стабілізацыі.**

Рост ваеннай небясьпекі

Канферэнцыя на разбраеньні ў Жэнэве, якая адбываецца ў сучасны момант, зьяўляецца ня больш як шыльдай для таго, каб захаваць ад мас ваенныя падрыхтаваньні супроць Савецкага Саюзу.

Вялізарны рост узбраеньняў ва ўсіх краінах набывае выключна пагражаючыя размеры. Захапіўшы вялізарныя тэрыторыі ў Кітаі, Японія далей кумляе вялікую колькасьць ваенных матар'ялаў. Гата сьведчыць аб узмоцненай падрыхтоўцы Японіі да вайны на сторонкі супроць Кітаю, колькі супроць СССР. Апетыты японскіх імпэрыялістаў заходзяць вельмі далёка. Цэлы рад дакументаў выяўляе іх імкненьні да захвату ўсяго савецкага Далёкага Усходу аж да Іркуцка. Антысавецкі характар японска-францускай палітыкі ў даны час усім ведамы.

СССР даказаў сваё міралюб'е. Але не ад нас залежыць развязка нарастаючых падзей. Небясьпека вайны набліжаецца да межаў краіны пралетарскай дыктатуры.

Буржуазія ўсяго сьвету зьбірае свае сілы ў адзін кулак, накіроўваючы іх супроць СССР, супроць міжнароднага пралетарыяту. У вайне шукае яна выхаду з эканамічнага крызісу, які дуцьць капіталістычныя краіны.

Сусьветны крызіс і эканамічныя баі пралетарыяту

Крызіс рэзка пагоршыў становішча рабочай клясы. Беспрацоўе дасягнула нячуваных размераў. У Германіі ім ахоплена каля 8 млн. чалавек, у ПАЗШ —каля 14 млн., у Англіі—больш 3 млн., **а ва ўсім сьвеце пік беспрацоўных каля 46 млн.**

Беспрацоўе выклікала вялізарную галечу і голад. Дзяржаўны апарат капіталістычных краін стараецца «ня прымячаць» гэтага.

Эканамічны крызіс капіталістычных краін тав. Лазоўскі супастаўляе з росквітам народнай гаспадаркі і з бесперапынным паляпшэньнем матар'яльна-бытавога становішча працоўных у СССР.

У існуючых умовах спрыяльным пытаньнем работы Прафінтэрну і ўсіх яго секцый зьяўляецца арганізацыя адпору наступленьню буржуазіі на рабочую клясу, а там, дзе магчыма, пераход да контрнаступленьня. Секцыі Прафінтэрну ва ўсіх краінах сьвету павінны біцца за тое, каб ахапіць сваім кіраўніцтвам найпярэйшыя рабочыя масы супроць уплыву рэфармісцкіх правадыроў. Эканамічныя баі ідуць ва ўсім капіталістычным сьвеце. Натхнёцелямі гэтай барацьбы, яе кіраўнікамі ўсюды зьяўляюцца камуністычныя партыі і секцыі Прафінтэрну. Яны вядуць ня толькі абарончыя баі, але і ў некаторых выпадках пераходзячы ў наступленьне, дабіваюцца павышэньня заработнай платы.

У гэтай барацьбе мацнеюць і растуць секцыі Прафінтэрну. У радзе выпадкаў чырвоныя прафсаюзы ў райках, дзе большасьць рабочых далучалася да рэфармісцкіх саюзаў, арганізоўвалі забастоўкі наперакор прэзідыюму рэфармісцкіх правадыроў (Польшча, Чэха-Славакія і г. д). Яны вырываюць рабочыя масы са сфэры ўплыву рэфармістаў, вядуць іх у бой супроць капіталізму.

Калі падрэсьлі вынікі эканамічнай барацьбы, дык трэба будзе прызнаць, што ня ўсюды яшчэ секцыі Прафінтэрну стаюць на вышыні становішча. Яны яшчэ адстаюць ад базавой гатоўнасьці мас. Аб гэтым трэба сказаць адкрыта з бальшавіцкай прастатой.

Секцыі прафінтэрну ў барацьбе з падпальшчыкамі вайны

Тав. Лазоўскі перашоў далей да асьвятленьня барацьбы секцый Прафінтэрну супроць вайны, якая падрыхтоўваецца імпэрыялістамі.

Асноўная задача заключаецца ў тым, каб гэту барацьбу неадрыўна вязаць з штодзённай работай чырвоных прафсаюзаў. У Японіі секцыя Прафінтэрну, якая налічвала ў сваіх радах невялікі парэчыслаў лік рабочых, значна ўмацавалася пасьля таго, як яна стала весьці энэргічную барацьбу супроць вайны.

Ня гледзячы на жорсткія рэпрэсіі з боку японскай паліцэйшчыны, секцыя дабілася вялікіх посьпехаў, а лік яе членаў урос да 35 тыс. чалавек. Вялікія посьпехі атрыманы ў гэтым напрамку і камуністычнай партыяй Японіі.

Наша барацьба супроць вайны зьвязана з рэвалюцыйнымі дзеяньнямі, а выкрыцьцём падапёкі падрыхтоўкі да яе. Бязьлітасны адпор трэба даць нацыфрыскай балбатне і тым, хто, спасылаючыся на нямінучасьць вайны, прабуе адмовіцца ад барацьбы супроць яе. Мы абавязаны адцяпуць яе як можна далей, бо чым далей, тым мацнейшым будзе міжнародны пралетарыят, тым слабейшымі будуць нашы клясавыя вораги.

Барацьба супроць вайны прасьпяла ў ў вёскі капіталістычных і калёніяльных краін. **Масы ня хочуць вайны нагул, асабліва яны ня хочуць вайны супроць Савецкага Саюзу. Іх спачуваньне на нашым баку.**

Здрадніцкая роля рэфармістаў

Якую ролю адыгрывае галёўны ворак у рабочай клясе—сацыял-дэмакратыя? Крызіс разьбіў усе рэфармісцкія тэорыі аб арганізаваным капіталізьме.

Заграніцай сур'ёзна загаварылі аб плянаваньні народнай гаспадаркі. Там вывучаюць наш плян і нават хочуць яму падражаць. Яны хочуць, зразумела, стварыць плян капіталістычны пад кіраўніцтвам капіталістаў.

Амстэрдамскі Інтэрнацыянал перад тварам нячуванага крызісу і беспрацоўя загаварыў аб тым, што капіталістычная гаспадарка ня можа знайсьці выхаду. Сацыял-дэмакраты не знайшлі нічога лепшага, як зьвярнуцца з хаданіцтвам у Лігу нацый аб уняесьньні «зьмен у існуючы лад» для таго, каб пазбавіцца ад крызісу.

Фактычна ўсе тэорыі і ўсе практыка амстэрдамцаў зводзяцца да таго, што неабходна ўсімі сіламі падтрымліваць буржуазію.

Японскія рэфармісты ня толькі не змагаюцца супроць вайны, але падтрымліваюць і апраўдваюць захват часткі кітайскай тэрыторыі.

Няма сумненьня ў тым, што калі вайна разгарыцца, дык рэфармісты ўсіх краін, адкінуўшы пацыфісцкую фразеалёгію, адкрыта падтрымаюць напад на Савецкі Саюз. Той паклёп, якім займаюцца яны ў адносінах да СССР, зьяўляецца пачатнім іншым, як **ідэалёгічнай падрыхтоўкай вайны.**

За ленінскую лінію ў сусьветным прафруху

Тав. **Лазоўскі** асьвятліў далей тую барацьбу, якую вядзе Прафінтэрн за ленінскую лінію ў прафруху. Правыя ўхілісты прабавалі прыстасавацъ палітыку прафсаюзаў да ідэалёгіі рэфармістаў. Ранейшае правапартыйнае кіраўніцтва УсеЦСПС падтрымывала правых яшчэ на IV кангрэсе Прафінтэрну. Гэта дало магчымасьць правым ухілістам, пасьля прыезду з кангрэсу ў свае краіны, заўчуць, што пастановы IV кангрэсу разыходзяцца з лініяй УсеЦСПС, зьяўляючыся «лініяй Лазоўскага». Яны добра разумелі, што ў нас няма і ня можа быць асабістай лініі. Гэты прыём ім быў патрэбен для дыскрэдытаваньня пастановаў кангрэсу, для ўнясеньня расколу ў рады Прафінтэрну і кампартыі. Вось чаму разгром правых апартуністаў у савецкім прафруху меў такое вялізарнае значэньне для Прафінтэрну. Гэта дапамагло нам разгрэміць правых у радзе краін.

Барацьба супроць правых ухілаў адбывалася роўнаведна з барацьбой супроць «левага» ўхілу.

Тав. **Лазоўскі** перайшоў да пытаньня аб рабоце Прафінтэрну, на перапоўненьні багацьцем вопыту савецкага прафруху ў другія краіны. Асабліва вялікае значэньне мае арганізацыя работы чырвоных прафсаюзаў на прадпрыемствах на аснове вопыту бальшавіцкай партыі да Камінтэрнцкай рэвалюцыі і вопыту практычнага правядзеньня ў жыцьцё лёзунгу—заўсёды з масамі і на чале мас.

Савецкі прафрух дабіўся вялізарных посьпехаў у ажыцьцяўленьні гэтага лёзунгу. Ён павінен быць праведзен у жыцьцё ва ўсіх краінах сьвету.

Зараз, калі сусьветная вайна ўжо фактычна пачалася на Далёкім Усходзе, калі яна набліжаецца да савецкіх межаў, вялізарнае значэньне атрымліваюць хутчэйшая мабілізацыя і арганізацыя рабочых мас усяго сьвету. Арганізацыя павінна быць вынесена в палітыкай. Гэту сувязь мы праводзім ва ўсіх секцыях Прафінтэрну, ва ўсіх пяці частках зямной кулі.

Ва ўсіх краінах сьвету расьце рэвалюцыйны рух

У заключнай частцы свайго дакладу тав. **Лазоўскі** асьвятліў рэвалюцыйныя ўздымы у калёніяльных і імпэрыялістычных краінах. У Кітаі мацнее Чырвоная армія. Яна захоплівае войскі працяўніка, перавыхоўвае іх і кідае ў бой у якасьці чырвоных часьцей. Нагадваецца вялізарны ўздым рабочага руху, асабліва ў Шанхаі. Адпор, аказаны японцам у Шанхаі, быў моцны тым, што ў ім прымалі ўдзел ня толькі салдаты, але і шанхайскія рабочыя, якія абаранялі сваю краіну ад уварваньня імпэрыялістаў.

Тав. Лазоўскі спыніўся затым на рэвалюцыйным руху ў іншых краінах—Гішпаніі, Індыі, Германіі і г. д. Ён адзначыў, што Польшча зьяўляецца краінай пярэдняй рэвалюцыі. Ва ўсіх часьцях гэтай краіны бесперапынна выбухаюць клясавыя баі.

Асноўная задача Прафінтэрну—**заваяваць большасьць рабочай клясы, раней усяго ў буйнейшых, а потым ва ўсіх краінах сьвету. Камінтэрн і Прафінтэрн ужо дабіліся таго, што сацыял-дэмакраты ня маюць манаполіі ў прафруху.**

Вайна набліжаецца да межаў СССР. Усе сымпатыі працоўных на баку Савецкага Саюзу. Мы змагаемся супроць вайны, мы робім усё, каб яе адцягнуць, але калі яна разгарыцца, калі буржуазія нападзе на Савецкі Саюз, дык члены Прафінтэрну ва ўсім сьвеце будуць разам з савецкімі рабочымі біцца за СССР, за канчатковую перамогу камунізму (бурныя воплескі).

*) Друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Хроніка зьезду

25 красавіка пасяджэньне зьезду працягвалася з 10 гадзін раніцы да 6 гадз. вечара. Было заслухана заключнае слова **тав. Лазоўскага. Зьезд аднагалосна пастанавіў ухваліць палітычную і практычную работу дэлегацыі УсеЦСПС у Прафінтэрне і прызнаў правільнымі пастановы V кангрэсу і VIII сэсіі Цэнтральнага Савету Прафінтэрну.** Для выпрацоўкі агульнай рэзалюцыі па дакладу тав. Лазоўскага была выбрана камісія ў складзе 21 чал.

Ранішнае пасяджэньне 26 красавіка

МАСКВА. На ранішнім пасяджэньні зьезду прафсаюзаў 26 красавіка было заслухана заключнае слова **тав. Ціхона**, пасьля чаго зьезд **аднагалосна пастанавіў ухваліць дзейнасьць Наркампрацы СССР і Цусстраху.** Для выпрацоўкі рэзалюцыі па дакладу Ціхона выбрана камісія ў складзе 23 чалавек.

Потым зьезд заслухаў даклад **тав. Пятакова** аб ходзе выкананьня плану па цяжкай прамысловасьці на 1932 г. ні.

Хроніка падрыхтоўкі да 1-га мая па Менску

* Паміж менскімі заводамі і фабрыкамі разгарнулася шырокае спаборніцтва па права біць у першай калёне дэманстрантаў і па права пакіраваць лепшых ударнікаў на ўрачыстае адкрыцьцё Дняпроўскай электрычнай станцыі. Напярэдадні ідуць заводы імя Варашылава, «Бальшавік», «Камунар» і фабрыка «Кастрычнік».

* На плянцы Парыскай Камуны і на плянцы Волі трыбуны будуць адбівать рост сацыялістычнага будаўніцтва, Чырвоную армію, крызіс у капіталістычных краінах. На трыбуне будзе зьмешчана 10 партрэтаў лепшых ударнікаў менскіх фабрык і заводаў.

* 30 красавіка ўвечары арганізуюцца ў кіно і тэатрах спэцыяльныя антырэлігійныя пастаноўкі і дэманстраваньне кіно-фільмаў. Камсамольская арганізацыя наладжвае факельнае шэсьце па горадзе.

* У часе першамайскіх дэманстрацый будуць арганізаваны мастацкія выступленьні: хор, музыка, эстрада.

* 1 мая будзе арганізован гарадзкі карнавал, з уздзелам калектываў тэатраў і мастацкіх гурткоў.

* 2 мая адбудуцца дзіцячая і фізкультурныя дэманстрацыі.

* Для ўдзелу ў сьвяткаваньні 1 мая прэзыдыум менскага гарсавету запрасіў у Менск дэлегацыі ад рабочых Масквы, Харкава, Дняпрапятроўску, Бабруйску, Віцебску, Гомелю, Смаленску, Магілева і дэлегацыю падшэфнага заслаўскага паграпатраду.

* Гарсавет абавязаў усе прадпрыемствы Менску не пазьней 29 красавіка выплаціць поўнасьцю зарплату рабочым і служачым за другую палову красавіка.

* Гарсавет выдае абавязковую пастанову аб часе гандлю і рабоце ў першамайскія дні.

* МЦРК, ТСТ, ЗРК павінны не пазьней 29 красавіка выдаць увесь паёк, згодна ўстаноўленых норм.

Лёзунгі да 1-га мая 1932 г.

1. Няхай жыве 1-ае мая—балвы агляд рэвалюцыйных сіл міжнароднага пралетарыяту!

2. Пралетары і прыгнечаныя народы ўсяго сьвету! Мацней удар па загніваючым капіталізьме. Няхай жыве пераможнае наступленьне пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце!

3. Братом па клясе — вязьням капіталу, ахвярам фашысцкага тэрору — каша пралетарскае прывітаньне!

4. У краінах капіталу расьце эканамічны крызіс, расьце беспрацоўе, мільёны рабочых і сялян асуджаны на голад і галечу. У краіне сацыялізму ў СССР ідзе ўздым прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, сьнішчана беспрацоўе, расьце матар'яльны ўзровень працоўных. Пралетары і працоўныя ўсіх краін, скідайце капіталізм, ідзеце па шляху рабочых і сялян СССР!

5. Імпэрыялісты рыхтуюць новыя войны, рыхтуюць напад на СССР. Пралетары ўсяго сьвету! Накіроўвайце зброю супроць сваёй імпэрыялістычнай буржуазіі, абараняйце краіну Саветаў — бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету!

6. Імпэрыялісты Японіі, Эўропы і Амэрыкі прыгнечваюць Кітай, праводзяць яго падзел. Далоў інтэрвэнцыю супроць Кітаю! Няхай жывуць Саветы ў Кітаі, арганізатары свабоды і незалежнасьці кітайскага народу!

7. Сацыял-фашысты — падпальшчыкі новых імпэрыялістычных вайнаў і інтэрвэнцыі супроць СССР, супроць Кітаю. Далоў правадыроў II-га Інтэрнацыяналу і іх «левую» агентуру! Пралетары ўсіх краін! Становіцеся пад бальшавіцкі лозунг ленінскага Камуністычнага Інтэрнацыянату!

8. Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал — балвы штаб сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі!

9. Толькі Савецкі саюз вядзе праўдзіву барацьбу за мір. Далоў антысавецкія правакацыі! Няхай жыве савецкая палітыка міру!

10. «Ні адзай пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі ні адзіна вяршка не аддамо нікому» (Сталін).

11. Няхай жыве Чырвоная армія — апора мірнай палітыкі савецкай улады, пільны вартавы савецкіх межаў, верны вартавы Кастрычніка!

12. Прывітаньне маладым байцом Чырвонай арміі, якія прысягаюць 1-га мая на вернасьць уладзе рабочых і сялян, на вернасьць рабочай клясе ўсяго сьвету!

13. Адкажам на пагрозу вайны і інтэрвэнцыі ўзмацненьнем бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва сацыялізму, ператорым кожны завод, саўгас, калгас у насакрушальную крэпасьць абароны краіны!

14. Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё. За бальшавіцкія тэмпы ў паданьня тэхнікай. Уперад, на барацьбу за поўнае завяршэньне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі СССР!

15. Рабочыя мэталюргіі! Краіна чакае ад вас 10 мільёнаў тон чыгуну ў гэтым годзе. Усе сілы на выкананьне гэтай бальшавіцкай праграмы!

16. Рабочыя-чыгуначнікі! Правядзем па-бальшавіцку рэканструкцыю чыгуначнага транспарту. Выканаем плян перавозак!

17. «Прадукцыйнасьць працы — гэта ў канчатковым разрахунку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу» (ЛЕНІН).

18. Ударнікам і ўдарніцам — перадавым змагаром за справу сацыялізму бальшавіцкае прывітаньне!

19. Мільёнам калгасьнікаў, моцнай апоры савецкай улады, гарачае пралетарскае прывітаньне! Няхай жыве саюз рабочых і сялян, якія будуюць і ўмацоўваюць калгасы!

20. Арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў і саўгасаў, правільнай пабудовай брыгад, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва — забясьпечым выкананьне пляну веснавой сяўбы і высокую ўраджайнасьць нашых палёў.

21. Рабочыя, калгасьнікі! Давершым справу ліквідацыі кулацтва як клясы, дабём рашткі кулацтва!

22. МТС — станавы хрыбет калектывізацыі. Ператворым МТС у сапраўдныя арганізатараў калгаснай вытворчасьці.

23. Узмацненьнем шэфства заводаў над установамі выхаваем новыя атрады актыўных будаўнікоў савецкай дзяржавы, разгорнем бязьлітасную барацьбу з бюракратызмам у савецкім апараце!

24. «Правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананьне справы — у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым гвоздзь усёй работы, усёй палітыкі» (ЛЕНІН).

25. Штодзённыя клопаты аб матар'яльна-бытавых патрэбах рабочых — важнейшая ўмова будаўніцтва сацыялізму. За далейшае паляпшэньне забясьпячэньня рабочых, са ўзорнае грамадзкае харчаваньне!

26. Далоў рвачоў і дэзарганізатараў гандлёва-каапэрацыйнай сеткі!, зрываючых забясьпячэньне рабочых і сялян! Прафсаюзы, работнікі РСІ, на барацьбу за паляпшэньне каапэрацыйна-гандлёвага апарату, на барацьбу за сумленны савецкі гандаль!

27. Навуку, усе дасягненьні культуры —на службу разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню.

28. За ленінскую нацыянальную палітыку. За адзінства і брацтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР!

29. Павысім ролю працоўных жанчын у грамадзкім і вытворчым жыцьці краіны.

30. Камсамольцы! Будзьце ў першых радах змагароў за сацыялізм, за індустрыялізацыю краіны, за аўладаньне тэхнікай, за арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў і саўгасаў, за аўладаньне марксыцка-ленінскай тэорыяй.

31. Юныя піянэры — дзеці Кастрычніка! Будзьце гатовы весьці далей і завяршыць вялікую справу Леніна — справу сусьветнага Кастрычніка!

32. Няхай жыве УсеКП(б)—арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

33. Рабочыя, калгасьнікі, усе працоўныя! Цясьней рады вакол УсеКП(б)! За генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы, за перамогу сацыялізму!

34. Лепшых ударнікаў, перадавых пралетараў і калгасьнікаў — у рады ленінскай партыі.

35. Рашткі капіталістычных клясаў аказваюць шалёнае супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню. Рабочыя і калгасьнікі! Павысім клясавую пільнасьць, умацуем пралетарскую дыктатуру, дабём рашткі капіталістычных клясаў!

36. Проч дэзарганізатараў сацыялістычнага наступленьня — правых і «левых» апартуністаў! Супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі. Супроць рэштак контр - рэвалюцыйнага трацкізму. Супроць прымірэнцаў і гнілых лібэралаў. Няхай жыве ленінскае адзінства бальшавіцкіх радоў!

37. Камуністы і камсамольцы! На перадавыя лініі барацьбы за выкананьне вялікіх задач чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі і за выкананьне пяцігодкі за 4 гады!

38. Пад сьцягам бальшавіцкай партыі, яе ленінскага ЦК — наперад, да новых перамог! Вышэй сьцяг УсеКП(б) — арганізатара Кастрычніцкай рэвалюцыі!

ЦК УсеКП(б)

Камунальнае будаўніцтва

НЕ ПЕРАВЫШАЦЬ ЛІМІТАЎ!

Заключэньне дагавароў на камунальнае і жыльлёвае будаўніцтва прасякнуць бальшавіцкім змаганьнем за зьніжэньне сабекошту кожнага кубамэтру плошчы

Згодна пастановы СНК БССР, заключэньне дагавароў на жыльлёвае камунальнае і культурна - бытавое будаўніцтва павінна быць скончана **да 1 мая 1932 г.**

Трэба запомніць, што ў 1932 годзе капітальныя ўкладаньні ў камунальнае, жыльлёвае і культурна - бытавое будаўніцтва БССР дасягаюць **75-80 млн. р.**: 26 млн. р. — камунальнае будаўніцтва, звыш 27 млн. руб.—жыльлёвае будаўніцтва і звыш 26 млн. руб. — школьнае, клюбнае, будаўніцтва НК аховы здароўя і г. д.

Дагаворная кампанія мае вялікае значэньне таму, што яна павінна выявіць, наколькі будучыя і будаўнічыя арганізацыі **падрыхтаваліся** да сэзону.

Матар'ялы, якія ёсьць у распараджэньні Наркамгасу і Белкамунбанку сьведчаць аб тым, што дагаворная кампанія разгортваецца вельмі марудна.

Па лініі прадпрыемстваў, спупчаных праз Цэкамбанк, заключана да гэтага часу толькі 60 проц. дагавароў, па выкананнях і жыльлёвай каапэрацыі —менш 20 проц., а па лініі «ФУБР» прамысловасьці (фонд паляпшэньня быту рабочых) Белкамунбанк да гэтага часу нават не атрымаў гадавога пляну і канчаткова ня высьветлены крыніцы пакрыцьця выкананьня гэтага пляну.

Дагаворная кампанія ў першыя-ж дні выкрыла рад недакладнасьцей пляніраваньня жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва. Гарсаветы своечасова не прадставілі ў Наркамгас патрэбных матар'ялаў для складаньня пляну і з гэтай прычыны паміж плянам, складзеным Наркамгасам (на падставе наяўных невыстарчальных матар'ялаў) і рэальнай будаўнічай праграмы гарсаветаў, ёсьць значныя разыходжаньні.

Наркамгас і менскі гарсавет да гэтага часу не маглі дагаварыцца пакончаткова наконт укліваньня ў будаўніцтве Грушаўскага і Пярэсьпенскага пасёлку таго ці іншага тыпу стандартных дамоў. Гомельскі гарсавет ня мае магчымасьці дакладна паказаць, колькі ім выдаткавана грошаў на будаўніцтва пазьні за 1931 г., што зьлўлюецца, зразумела, затрыманьнем для афармленьня дагавору.

Пры заключэньні дагавору па такім буйным аб'екце, як дом-камуна ў Гомелі, выявілася, што гомельская будкантора перабрала за 1931 г. 200 тыс. руб. і ні аддзяленьне Белкамунбанку, ні гарсавет ня выкрылі гэтага да канца году.

Дагаворная кампанія таксама паказала, што будучыя і будаўнічыя арганізацыі не вядуць у выстарчальнай ступені барацьбы за зьніжэньне сабекошту. Некаторыя будаўнічыя канторы прымушаюць буйучыя арганізацыі заключаць кабальныя дагаворы, якія «авансам» выкодзяць не са зьніжэньня сабекошту, а з павялічэньня яго. Напрыклад, Менбуд настойвае, каб транспарт яму аплачваўся не паводле лімітаў, а па фактычных [illegible]; гомельская будкантора Белкамунбанку ў мінулым годзе заключыла 90 проц. дагавароў, выходзячы з фактычнага сабекошту, а не з лімітаў. У той час, як максымальны ліміт на 1931 г. па будаўніцтве драўляных дамоў быў 15 р. за кбм., гомельская будкантора Будаб'яднаньня заключала дагаворы, выходзячы з каштоўнасьці 27 руб. кбм.



Скончана пабудова масту на Ляхаўцы, зараз ідзе работа па праклядцы трамвайнай лініі.

Будаўнічыя арганізацыі не аддаюць выстарчальнай увагі пытаньню будаўніцтва. Напрыклад, на будаўніцтве Саюзтрэнсу ў Менску (вул. імя Валадарскага) менш дэфіцытныя матар'ялы замяняліся больш дэфіцытнымі: замест вапны ўжываўся цэмэнт, замест бэлек аднаго сячэньня скарыстоўваліся бэлкі большага сячэньня, пры гэтым кошт транспарту складаў 75 проц. кошту будматар'ялаў.

Усё гэта ў значнай ступені тлумачыцца тым, што дагаворная кампанія запаўнілася за наладжаньне сацыялістычнага ўліку — гэтага адказнага вучастку сацыялістычнай арганізацыі працы. **Правільна пабудаваны ўлік** дапамагаў нам плянаваць і сацыялістычна арганізоўваць працу, вырашаць тэхнічныя праблемы і карэктаваць тэхналёгічны працэс вытворчасьці. Раней толькі праз некалькі дзён можна было ўстанавіць (ды і тое прыблізна), як працавалі ў такі-та дзень ліцейны і мэханічна-зборачны цэхі. Зараз вы можаце даведацца аб становішчы вытворчасьці на кожную гадзіну. Узорна плянуе сваю работу вытворчы цэх. І гэта таму, што ён правільна ацаніў ролю ўліку.

Мы змаглі параўнальна хутка выправіць промахі і памылкі, дапушчаныя пры пуску заводу ў камплектаваньні кадраў і іх навучаньні. Гэтыя акалічнасьці зрабілі моцны ўплыў на асваеньне праектнай магутнасьці заводу. Мы працягваем работу па падрыхтоўцы кадраў, і на сёнешні дзень рознымі відамі вучобы ахоплены звыш 3.500 рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу.

Хутка вырас пяцьдзесяцігодкі, сёньня ён свабодна выпускае за адну зьмену 80 і больш трактараў. Сёньня на яго канвэерах ужо няма тай сьмяротнай ліхаманкі, якая наглядалася год назад. Завод набыў вытворчую ўстойлівасьць і ўпэўнена набірае тэмпы. СТЗ накапіў багаты вопыт работы па-новаму і ў новых умовах.

Посьпехі заводу — гэта ў першую чаргу посьпехі яго партыйнай арганізацыі. Толькі дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву трактарны завод змог у такіх шырокіх разьмерах прыстасаваць сацыялістычную арганізацыю працы да новай тэхнікі і на працягу 20 месяцаў ня толькі асвоіў апошнія дасягненьні амэрыканскай тэхнікі, але і перакрыў іх на радзе адказных вучасткаў, паказаўшы **свае** тэмпы, **свае** ўзоры тэхнічнай работы.

Ці зьяўляецца мяжой для Сталінградзкага заводу выпуск 144 трактараў у дзень? Не, гэта не мяжа. **Наша задача заключаецца ня толькі ў тым, каб дасягнуць сучаснага ўзроўню капіталістычнай тэхнікі, але і ў тым, каб перакрыць гэты ўзровень, даць узоры сваёй тэхнікі, якая павінна стаць вышэй таго, што мог стварыць капіталізм.** Мы з гонарам можам заявіць, што нашы маладыя кадры рабочых, нашы маладыя камандзіры вытворчасьці, і ў прыватнасьці, кавалі і ліцейшчыкі абагналі лепшыя загатоўчыя майстэрні. Мы ня толькі асвоілі найлепшыя дасягненьні амэрыканскіх кавалёў, але **і перакрылі іх.** У ліцейным цэху мы ўжо сёньня на цэлым радзе складаных дэталяў перакрываем запраектаваныя нормы.

Гэтых паказальнікаў мы дабіліся таму, што ў нас зусім іншая сыстэма гаспадараньня. Мы ня проста капіруем амэрыканскую тэхніку. Асвойваючы яе, мы адначасова творым, імкнемся вызваліць яе ад тых кайданоў, якімі яка скавана ва ўмовах капіталістычнай гаспадаркі.

Можна прывесьці шмат прыкладаў, калі бальшавікі Трактарнага, скарыстоўваючы апошнія дасягненьні капіталістычных краін і ўзброеныя сацыялістычнай арганізацыяй працы, пайшлі далей на шляху тэхнічных удасканаленьняў. Гэта работа толькі пачынаецца. Але ўжо першыя вынікі, якія мае завод на гэтым вучастку, даюць яму магчымасьць лічыць, што на базе цяперашняга абсталяваньня ён можа **даць значна больш высокую прадукцыйнасьць, чым у Амэрыцы.**

За лік скарачэньняў прастояў, напрыклад, можна павысіць прадукцыйнасьць заводу да 10 проц. Шмат што можа атрымаць завод і ад скарачэньня браку, асабліва ў ліцейным цэху. Тут па зьніжэньні браку аддзівак можна павысіць выпуск ліцьця да 10 проц.

144 — не апошняе наша слова. Наша задача заключаецца зараз у тым, каб дакладна праверыць усё наша абсталяваньне, яго прапускную здольнасьць і на аснове 6 указаньняў тав. Сталіна намеціць канкрэтны плян далейшага разгортваньня вытворчасьці і няўхільнага павышэньня выпуску трактараў.

Пяцьдзесяцігодкі — Сталінградзкі трактарны — знаходзіцца на гістарычным этапе. Асвоіўшы новую тэхніку, асвоіўшы праектную магутнасьць замежнага абсталяваньня, ён бярэ курс на яе перакрыцьцё. Ён пакідае ззаду сусьветныя заводы Форда, Маккорміка, Катэрпілера, якія задыхаюцца ад крызісу. Ён выступае ў перадавых радох байцоў — за сацыялістычныя тэмпы.

Інж. **А. Пудалаў** (дырэктар СТЗ).
К. Трыгубнікаў (сакратар партакому).
Інж. **І. Шэйман** (нач. кузьні).
Інж. **І. Мэламэд** (нач. мэх. зборачнага).
Інж. **Ю. Вяржынскі** (нач. ліцейнага).
Інж. **Л. Гросс** (нач. інструментальнага цэху).
Інж. **В. Кузьмін** (нач. лябараторыі).
В. Салаўёў і С. Цмыг (рэдакцыя газэты «Даешь трактор»).

(Падаецца ў скарочаным выглядзе «Правда» 24 красавіка).

144—у дзень

Вопыт Сталінградзкага трактарнага заводу мае для нашай краіны гістарычнае значэньне. На гэтым заводзе мы **ўпяршыню пракладвалі канкрэтны шлях барацьбы за новую тэхніку, вучыліся злучаць «апошнія дасягненьні тэхнікі з сацыялістычнай арганізацыяй працы» (Ленін).**

Гэты вопыт ужо многаму навучыў нашы новабудоўлі. Харкаўскі трактарны, маскоўскі аўтамабільны завод імя Сталіна ўлічылі нашы ўрокі і асвойваюць новую тэхніку больш хуткімі тэмпамі.

Нескаторыя таварышы лічаць, што калі мы купляем за мяжой лепшае абсталяваньне, запрашаем спэцыяльных кансультантаў, атрымліваем у заграніччых праектовачных фірм гатовыя плянты, дык нашым інжынэрам і адміністрацыйна-гаспадарчым работнікам нічога не застаецца рабіць, як сядзець у габінэце і спакойна падлічваць выпуск прадукцыі. Глыбока памыляюцца гэтыя таварышы. Каб пусьціць першы трактарны, каб дабіцца выраднай работы ўсіх яго мэханізмаў, нам прыйшлося ў працэсе барацьбы за разгортваньне вытворчасьці выпраўляць недахопы праектаў, зьмяняць тэхналёгічны працэс на паасобных вучастках.

Вазьмеце і зьверце праект кузьні з цяперашнім тэхналёгічным працэсам. Вялікая розьніца! Дэталі тут ідуць у іншых напрамках, зусім іншая тут узаемадзейнасьць абсталяваньня. У ліцейным, мэханічна-зборачным рэзка зьмешаны мэталы апрацоўкі раду дэталяў. Многія часткі трактару па канструкцыі, па мэталі здзяўчаюцца ад праекту. Гэтыя зьмены рабіліся не таму, што нам дрэнна запраектавалі завод і выбралі няўдалыя машыны. Не! Сталінградзкі трактарны ня гледзячы на тое, што ён зьяўляўся першай пробай нашых тэхнічных сіл, быў запраектаваны ня дрэнна. **Але мы — бальшав

АБ РАЗГОРТВАНЬНІ САМАЗАГАТОВАК

Пастанова ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне ЦКК-НК-РСІ аб выніках абсьледваньня становішча самазагатовак, бюро ЦК КП(б)Б канстатуе, што ня гледзячы на пастанову кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні самазагатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў, каапэрацыйныя і гандлёвыя арганізацыі зусім слаба разгарнулі гэту работу.

ЦК таксама адзначае, што раённыя партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі не аказалі сапраўднай дапамогі практычнаму ажыцьцяўленьню гэтых дырэктыў.

Надаючы пытаньню самазагатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў важнейшае значэньне і, лічачы гэту справу адной з галоўнейшых задач савецкага гандлю, ад выраўнаньня якой залежыць паляпшэньне рабочага снабжэньня, бюро ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе каапэрацыйныя і гандлёвыя арганізацыі дабіцца неадкладнага рашучага пералому ў справе разгортваньня самазагатовак, для чаго ажыцьцявіць наступныя мерапрыемствы:

1. Разгарнуць разам з калгаснымі, прафсаюзнымі і раённымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі глыбокую арганізацыйна-масавую работу па заключэньні дагавораў як на продаж калгасамі, калгаснікамі, саўгасамі і адпаасобнікамі лішкаў прадукцыі, так і на прадукцыю, якая спэцыяльна вырабляецца імі звыш цэнтралізаванага пляну для прымацаваных рабкопаў і арганізацый грамадзкага харчаваньня (адкорм, гадоўля дробнай жывёлы, арганізацыя зьяўпа-малочных пунктаў, пасадка ягад, апрацоўка гародніны, выраб тары і г. д.).

2. Устанавіць, што загатоўшчыкі маюць права праводзіць самазагатоўкі, а калгасы і саўгасы продаваць ім у адпаведнасьці з прынцыпамі савецкага гандлю лішкі сваёй продукцыі пры ўмове акуратнага выкананьня саўгасамі і калгасамі пэрыядычных заданьняў, паводле цэнтралізаванага пляну загатовак (месячныя і квартальныя).

Устанавіць, што каапэрацыйныя і гандлёвыя арганізацыі маюць права ў парадку самазагатовак загатаўляць цілят і авечак, а таксама і сьвіней да 4-х месяцаў для адкорму на сваіх адкормачных пунктах.

3. Устанавіць, што самазагатоўкі могуць весьціся арганізацыямі, дапушчанымі да іх ва ўсіх раёнах БССР, захаваўшы, аднак, парадак прымацаваньня (праз к-т загатовак) каапэрацыйных і гандлюючых арганізацый да паасобных раёнаў.

4. Падкрэсьліваючы, што дагавор павінен стаць асноўнай формай узаемаадносін паміж каапэрацыйнымі і гандлюючымі арганізацыямі, з калгасамі, калгаснікамі і саўгасамі па самазагатоўчых апэрацыях, бюро ЦК прапануе органам, якія вядуць самазагатоўкі, прадугледзіць у дагаворы стымуляваньне здатчыкаў сельска-гаспадарчых прадуктаў, за выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў па самазагатоўках. Пры чым стымуляваньне павінна разгортвацца ў наступным парадку:

а) прадугледжваньне пераважнага забесьпячэньня па востра-дэфіцытным таварамі (галянтарэя, трыкатаж, гаспадарчыя вырабы і г. д.) з устанаўленьнем дыфэрэнцыраванага разьмеру пераважнага снабжэньня, у залежнасьці ад характару загатоўленых прадуктаў;

б) авансаваньне мерапрыемстваў, якія накіраваны на стварэньне дадатковых рэсурсаў для рабочага забесьпячэньня;

в) аказаньне практычнай дапамогі калгасу і саўгасу праз грамадзкія арганізацыі (рамонт інвэнтару, дапамога пры сяўбе і ўборцы, наладжаньне справаздачнасьці, культбытавая дапамога і г. д.).

5. Дазволіць каапэрацыйным і гандлюючым арганізацыям, якія вядуць самазагатоўкі, арганізацыю загатоўчых пунктаў у раёнах, прымацаваных да іх з тым, аднак, што ў першую чаргу загатоўчымі пунктамі павінны быць ахоплены глыбінныя вёскі і населеныя пункты.

6. Дапусьціць у глыбінных пунктах, невыстарчальна ахопленых плянавымі загатоўкамі, арганізацыю пераапрацоўчых пунктаў (малочныя, засолачныя, сушыльні і г. д.).

7. У мэтах стымуляваньня разгортваньня загатовак, дазволіць БКС выдаткоўваць харчовыя прадукты (за выключэньнем хлеба), загатоўленыя звыш рэспубліканскага пляну, для паляпшэньня снабжэньня рабочых важнейшых галін народнай гаспадаркі.

8. ЦК прапануе мясцовым партыйным, прафсаюзным і каапэрацыйным арганізацыям палепшыць склад загатоўчых работнікаў, вылучыўшы лепшых работнікаў з каапэрацыйна-гандлюючага апарату для непасрэднага кіраўніцтва і разгортваньня самазагатовак, вызначыўшы заахвочваючую сыстэму зарплаты закупшчыкам у залежнасьці ад прадметаў і разьмеру закупкі.

Белкаапсаюзу для арганізацыі кіраўніцтва ўсёй справай самазагатовак вылучыць групу пры сэктары снабжэньня.

9. Надаючы выключнае значэньне самазагатоўкам, ЦК абавязвае раённыя камітэты партыі і раённыя выканаўчыя камітэты аказаць усямерную садзейнасьць разгортваньню самазагатовак па тэрыторыі свайго раёну.

Адначасова ЦК абавязвае РК, РВК і РКК-РСІ ўстанавіць кантроль над работай гандлюючых арганізацый у галіне самазагатовак, не дапускаючы ажыятажу ў раёне тавараабменных апэрацый і іншых скажэньняў прынцыпаў самазагатовак.

10. Ухваляючы мерапрыемствы ЦКК-РСІ аб прыцягненьні да адказнасьці асоб, вінаватых у скажэньні палітыкі савецкага гандлю, ЦК папярэджвае, што бязініцыятыўнасьць, разгортваньне самазагатовак на рэйках «чыстага» гандлю,—праяўленьне ў гэтай справе нэпманаўскага духу будзе расцэньвацца, як грубае парушэньне адной з важнейшых дырэктыў партыі і як яўнае наўменьне вырашыць адказнейшыя задачы рабочага снабжэньня.

11. Даручыць сакратарыяту ЦК у бліжэйшы час заслухаць даклады 2-3 райкомаў (прамысловых) аб парткіраўніцтве па пытаньнях самазагатовак у раёне.

АБ СКАЖЭНЬНІ САВЕЦКАГА ДРОБНАГА ГАНДЛЮ КААПЭРАЦЫЙНА-ГАНДЛЁВЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 22 красавіка 1932 г.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК канстатуюць, што за апошні час выяўлен рад абураючых фактаў скажэньня савецкай палітыкі цэн, характэрнымі з якіх зьяўляюцца:

а) адвольнае павышэньне цэн на прадуктовыя і прамысловыя тавары ў сыстэмах райспажыўсаюзу, лесрабкопу, Белгандлю, ЦРК, ЗРК і г. д.;

б) гуртовыя зьцэлкі (купля, продаж) тавараў над выглядам самазагатовак па раздробных цэнах;

в) ашукваньне рабочага пакупніка (абважваньне, абмерваньне) пры водпуску тавараў (на адзін кілёграм недахват ад 10 да 50 грам);

г) продаж тавараў нізкага гатунку па цэнах вышэйшага гатунку;

д) продаж тавараў з прымусовым асартымэнтам.

ЦК і ЦКК лічаць, што гэтыя грубыя скажэньні палітыкі цэн сьведчаць аб невыстарчальнай барацьбе паасобных партыйных, прафэсыянальных і гандлёвых арганізацый з канкрэтнымі носьбітамі нэпманскага духу, што да гэтага часу яшчэ не забясьпечана наўсюднае партыйнае і гаспадарчае кіраўніцтва кожнай крамай, кожным гандлёвым пунктам.

Выходзячы з вышэйпаказанага, бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК пастанаўляюць:

1. Прыняць да ведама, што пры праверцы правядзеньня дырэктыў партыі аб цэнах дзяржаўнай інспэкцыяй цэн, зьняты з работы і адданы пад суд загадчыкі і работнікі крам, вінаватыя ў адвольным павышэньні цэн, злоўжываньнях (абважваньне і абмерваньне), продажы тавараў з прымусовым асартымэнтам, сьпіс якіх давесьці да ведама шырокай савецкай грамадзкасьці.

а) Па спажыўсыстэме зьняты з работы і адданы пад суд: **Лухавец**—загадчык крамы **арлеўскага** спажыўтаварыства (Полацак); **Дворкін**—загадчык крамы БКС (Віцебск), **Ярыноўскі**—прадавец крамы ТСТ (Віцебск), **Ланкін**—загадчык крамы ЗРК фабрыкі імя Крупскай (Менск), **Крызмеська**—загадчык крамы саранскага спажыўтаварыства (Дрыса), **Шэнэх**—загадчык крамы **вароніцкага** таварыства (Полацак), **Дрозд**—загадчык крамы **астровінскага** СТ (Полацак), **Росіч**—загадчык крамы сельспажыўтаварыства (Жыткавічы), **Баравец**—загадчык крамы **Луначарскага** сельспажыўтаварыства (Дрыса), **Левін**—памесьнік загадчыка газавай крамы ЦРК (Менск), **Мінін**—загадчык крамы **арлеўскага** сельспажыўтаварыства (Полацак), **Васаў**—загадчык крамы № 7 ЗРК швэйнікаў (Віцебск).

Зьняты з работы: **Варанкоў**—загадчык крамы ЦРК, **Хайкін** — загадчык крамы водпікаў, **Кунва** — загадчык крамы ЦРК, **Елкін** — загадчык крамы ЦРК (Віцебск); **Шлакоўскі**—прадавец крамы сельспажыўтаварыства (Лельчыцы), **Баркан** загадчык гандлёвым аддзяленьнем ЗВК (Полацак), **Макараў**—загадчык крамы БКС, **Янкельсон**—загадчык крамы начыньня БКС (Віцебск), **Балтрухоў**—загадчык крамы Дрэтуньскага сельспажыўтаварыства (Полацак), **Рапапорт**—нам. загадчыка газавай крамы ЦРК (Менск).

б) **Па сыстэме Белгандлю і іншых арганізацыях** зьняты з работы і адданы пад суд: **Альшэўскі**—загадчык крамы «Спартак» (Асьвея); зьняты з работы: **Васэрман**—загадчык крамы № 19 Белгандлю (Менск), **Лазарын**—загадчык крамы таварыства «Прыхільнік дзяцей»—(Віцебск), **Нахамкін**—загадчык крамы сампрамсаюзу (Віцебск).

За ніяважлівыя адносіны да калькуляцыі цэн па абеды, адвольнае павышэньне цэн на абеды і прадукты ў буфэтах, абважваньне пры водпуску прадуктаў зьняты з работы:

Па сыстэме грамадзкага харчаваньня: **Відман**—загадчык сталоўкі фабрыкі «Дзьвіна» (Віцебск), **Грандз**—загадчык буфэту на фабрыцы імя Лекерта (Віцебск).

Падвергнуты асабістай чыстцы **Ушакоў**—загадчык газавай крамы № 27 ЦРК (Менск).

Прыняць да ведама, што старшыня Бабруйскага райспажыўсаюзу тав. **Эрэнбург**, загадчык сэктару снабжэньня Лесбелу тав. **Зскіна**, старшыня Горацкага райспажыўсаюзу — тав. **Чаўпэль** за грубае скажэньне савецкай палітыкі цэн прыцягнуты партыкалегіяй да партадказнасьці.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК адзначаюць, што ня гледзячы на канкрэтныя дырэктывы ЦК і ЦКК аб узмацненым кантролю і арганізацыі праверкі ў ажыцьцяўленьні савецкай палітыкі цэн, бюро РК і прэзыдыумы РКК **Хойніцкага, Полацкага, Талачынскага і Церахаўскага** раёнаў фармальна адносіліся да гэтай справы, даўшы няпраўдзівыя паведамленьні ЦК і ЦКК аб адсутнасьці парушэньняў, між тым зробленай паўторнай праверкай ЦКК выяўлена шмат фактаў скажэньня савецкай палітыкі цэн, за што РК і прэзыдыумам райКК адзначаных раёнаў паставіць на від.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б АБАВЯЗВАЮЦЬ:

а) гарадзкім і раённым камітэтам, КК-РСІ і парт'ячэйкам каапэрацыйна-гандлёвых сыстэм узмацніць штодзённы кантроль за ажыцьцяўленьнем савецкай палітыкі цэн;

б) цэнтральным гандлюючым арганізацыям над адказнасьць кіраўнікоў на працягу дзеннага тэрміну ўстанавіць сыстэмы адказнасьці работнікаў на ўсіх зьвеньнях гандлюючых арганізацый за правільную калькуляцыю і продаж тавараў, узмацніўшы апэрацыйнае кіраўніцтва пізавой сеткай, папярэдзіўшы, што побач з канкрэтнымі парушальнікамі адказваюць за правільнасьць праведзеньня савецкай палітыкі цэн таксама і кіраўнікі;

в) ЦСПСБ забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі аб шэфстве рабочых над каапэрацыйна-гандлюючымі арганізацыямі, арганізаваўшы пастаянны рабочы кантроль над кожным гандлюючым пунктам (крамай, буфэтам, сталоўкай, ларком і інш.);

г) ЦП саюзу каапэрацыі і дзяржаўнага гандлю неадкладна разгарнуць работу сярод каапэрацыйна-гандлёвых работнікаў па падставе сацыяльнага ўдзіцтва і ўдарніцтва ў напрамку лепшага абслугоўваньня спажыўца; водпуск тавараў чыстай вагой, мерай і паводле ўстаноўленых цэн, не дапускаючы водпуску тавараў з прымусовым асартымэнтам, вядучы рашучую барацьбу з фармальна-бюракратычнымі адносінамі, разгортваючы крытыку і самакрытыку сярод работнікаў каапэрацыйна-гандлюючых сыстэм.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК прапануюць дзяржаўнай інспэкцыі цэн узмацніць барацьбу з усякімі відамі парушэньня савецкай палітыкі цэн.

Надзвычайнаму раённаму зьезду Саветаў Койданаўшчыны—бальшавіцкае прывітаньне!

Пад знакам барацьбы за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, за поўнае выкананьне пасеўных плянаў, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў будзе праводзіць сваю работу раённы зьезд

Перавыбары прадэманстравалі правільнасьць ленінскай нацыянальнай палітыкі

КОЙДАНАВА. (Наш спец. карэспандэнт). Перавыбары сельскіх саветаў у раёнах скончаны. Яны прайшлі пры ўзьнятай актыўнасьці выбаршчыкаў. Калі ў перавыбарах 1930 году, прасцант удзелу выбаршчыкаў у перавыбарчай кампаніі складаў 68 проц., дык цяпер ён значна ўзрос і дасягнуў 77,3 проц.

Вялікая актыўнасьць выбаршчыкаў была ў нацыянальных польскіх сельсаветах. У Бараўскім сельсавеце зьявілася на выбарчыя сходы 80,7 проц. агульнага ліку выбаршчыкаў, у тым ліку жанчын—76,5 проц.; Палапеўскім—89,1 проц., жанчын—80,3 проц., Ляхавіцкім—77 проц. жанчын—70,9 проц. Негарэльскім—78,7 проц., жанчын — 72,6 проц. і г. д.

Сваёй актыўнасьцю польскае працоўнае насельніцтва дэманстравала сваю салідарнасьць з правільнай ленінскай нацыянальнай палітыкай партыі, якая ў прыватнасьці выразілася ў рэарганізацыі Койданаўскага раёну ў нацыянальны польскі раён.

З выбраных на раённы зьезд саветаў—77,7 проц. калгаснікаў. Гэта лічба гаворыць аб вялікіх посьпехах раёну ў справе калектывізацыі. Замацаваць гэтыя посьпехі, дабіцца арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў на аснове выкананьня і перавыкананьня плянаў 3-ай бальшавіцкай вясны—такая асноўная задача новавыбраных сельскіх саветаў і гэта-ж задача павінна быць асноўнай на раённым зьезьдзе саветаў. Раён ідзе да зьезду з значнымі дасягненьнямі. У параўнаньні з 30 годам у 1931 годзе выдаткаваньні па бюджэце на рэканструкцыю сельскай гаспадаркі павялічыліся на 33 проц., на народную асьвету—на 65 проц., на ахову здароўя—на 73 проц. і г. д. Вялікае дасягненьне ёсьць у жывёлагадоўчых саўгасах. Па саўгасах Сьвятыі, якая ў прыватнасьці выразілася натрэсту ў 1930 годзе было 1.633 шт. сьвіней, у 1931 годзе сьвіное пагалоўе вырасла да 11.076. Пагалоўе кароў у саўгасах павялічылася з 2.704 у 1930 годзе, да 5.663 у 1931 годзе.

Гэтыя лічбы кажуць аб тым, што дабрабыт працоўных раёнаў год ад году паляпшаецца.

Вялікія дасягненьні ёсьць і па бытавым абслугоўваньні насельніцтва. Пры саўгасах працуюць яслі. У бліжэйшы час пры калгасах раёну адкрываецца 96 яслей. Двухмесячныя курсы выпусьцілі 43 загадчыкаў яслей, курсы чырвоных сясьцёр — 37 чал.

Падрыхтоўка да зьезду ператварылася ў мабілізацыю працоўных мас вакол гаспадарча-палітычных задач, пастаўленых партыяй і ўрадам. Працоўныя Койданаўшчыны прыхоцяць да раённага зьезду саветаў з новымі перамогамі.

М. Сакалоўскі.

ЦК КП(б)Б, ЦВК БССР, VII надзвычайнаму зьезду Койданаўскага раёну

Рапарт калгасу імя Крупскай, Ляхавіцкага сельсавету

Рэарганізацыя Койданаўскага раёну ў нацыянальны польскі—новы вялікі пераможны крок у ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У фашысцкай Польшчы, дзе пануе дыктатура памешчыкаў і капіталістаў, з дня на дзень паглыбляецца эканамічны крызіс. Кожны дзень закрываюцца фабрыкі, сотні тысяч рабочых паляцкаў і іншых нацыянальнасьцяй выкідваюцца на вуліцу, узрастаюць падаткі, руйнуючы сялянскія гаспадаркі.

У нас, у краіне Саветаў, рабочая клясa і працоўнае сялянства, пад кіраўніцтвам ленінскай кампартыі, пераможна будуюць сацыялізм, шпарка крочаць да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Польскае працоўнае насельніцтва з году ў год прымае найпырэйшы ўдзел усацыялістычным будаўніцтве.

Наш калгас імя Крупскай аб'яднае 4 пасёлкі — Падгуб'е, Судзікі, імя Леніна і Сталіна. З посьпехам закончыўшы кампанію па выкананьні ўсіх загатоўчых заданьняў, мабілізацыі сродкаў, яшчэ ў пачатку стуженя мы пачалі рыхтавацца да трэцяй бальшавіцкай вясны.

Да тэрміну адрамантавалі інвэнтар, збрую, стварылі насенны фонд. За зіму мы вывезьлі на поле 430 вазоў гною і прывезьлі ў калгас 7 тон штучнага ўгнаеньня. У выніку пасьпяховага скатаваньня падрыхтоўчай кампаніі да сяўбы, калгас заняў першае месца ў Койданаўскім раёне і 13 красавіка распачаў сяўбу. На 23 красавіка наш калгас засеяў 9 га аўса, 6,5 га ашаніцы, 2,5 сэрадэлы. За ўдарную работу калгас прэміраваны РВК на суму 300 руб.

Гэтых посьпехаў мы дасягнулі ў выніку ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна.

Аднак, мы не павінны прайсьці міма тых недахопаў, якія ў нас ёсьць. Ня ўсе калгаснікі яшчэ ліквідавалі сваю няпісьменнасьць.

А адзнаку VII надзвычайнага зьезду саветаў абавязваемся закончыць сяўбу да 20 мая. Арганізаваць пры калгасе дзіцячыя яслі, гурток па ліквідацыі няпісьменнасьці на польскай і беларускай мовах. Усіх калгаснікаў і калгаснік завербаваць у грамадзкія арганізацыі. Арганізаваць гурток па аўладаньні вайсковай тэхнікай.

Абавязваемся яшчэ шырэй разгарнуць сацэпаборніцтва і ўдарніцтва ў барацьбе за тэрміновае скончэньне сяўбы і за выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. Запэўніваем раённы зьезд саветаў, што яшчэ больш узмоцнім клясавую пільнасьць у барацьбе за генэральную лінію партыі.

Просім раённы зьезд саветаў Койданаўшчыны падаць нашаму раёну назву вялікага чэкіста Фэлікса Дзяржынскага.

Няхай жыве VII надзвычайны зьезд саветаў Койданаўшчыны!

Па даручэньні агульнага сходу калгаснікаў.

Прэзыдыум сходу—**Баўтручок, Земурэцкі і Хаменка.**

ПРЫВІТАНЬНЕ УСЕУКРАІНСКАГА ЦВК КОЙДАНАУСКАМУ РАЁННАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАУ

Усеукраінскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт шле палкае пралетарскае прывітаньне працоўным масам Савецкай Беларусі ў сувязі з арганізацыяй новага польскага раёну, што зьяўляецца лепшым довадам паўхільнага ажыцьцяўленьня з боку камуністычнай партыі і савецкай улады ленінскай нацыянальнай палітыкі і што нацыянальнае пытаньне можа быць вырашана правільна толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту.

Усеукраінскі ЦВК упэўнен, што польскае працоўнае насельніцтва разам з працоўнымі іншых нацыянальнасьцяй яшчэ больш напружыць свае сілы для ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР, для пераможнага завяршэньня пяцігодкі ў 1932 годзе, пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы.

Старшыня ўсеукраінскага ЦВК ПЯТРОЎСКІ.

Койданаўскаму раённаму зьезду Саветаў

Жадаю зьезду нацыянальнага польскага раёну плённай працы.

Раён павінен стаць перадавым у выкананьні ўсіх дырэктыў партыі і ўраду.

Сакратар савету нацыянальнасьцяй Саюзу ССР ТАДЖЫЕЎ.

Абвяшчаем фабрыку суцэльна пісьменнай

(З рапарту рабочых фабрыкі „Кастрычнік")

20 красавіка г. г. з фабрычнага ліквпункту выпушчана 39 рабочых і работніц, якія ліквідавалі сваю няпісьменнасьць. Апрача гэтага, 13 рабочых закончылі ліквідацыю няпісьменнасьці на даму, да якіх былі прымацаваны культармейцы. У школы малапісьменных накіравана 145 рабочых і работніц.

Гэтымі днямі з фабрычнага ліквпункту выпушчаны апошнія 17 чалавек.

Рапартуючы аб выкананьні дырэктывы партыі і ўраду, мы абавяшчаем чырвонасьняжную фабрыку «Кастрычнік» фабрыкай суцэльнай пісьменнасьці.

Запэўніваем ЦК КП(б)Б і ўрад БССР, што разгорнем бальшавіцкі штурм па ліквідацыі малапісьменнасьці, бадзёвую работу за стопроцантную пісьменнасьць ня ніжэй 4 груп, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за ўзмацненьне сацыялістычнай базы, за другую пяцігодку, за бясклясавае грамадзтва.

Па даручэньні рабочых фабрыкі:

Сакратар парткому — КАЦ.

Дырэктар фабрыкі — ЛЕВІН.

Старшыня масавага сэктару— ВАРКАЛОЎ.

Зьм. ПАВАРОТНЫ, В. АЛЕКСАНДРОВІЧ

Кропка з хвосьцікам

Калгасны брыгадзір Палікар Пятроў, малады чырвонашчокі мужчына, з вялікай напружанасьцю і стараньнем выпоўніць кожную літару і ад таго яны—пяроўныя і сьмешныя—разьбягаюцца ў розныя бакі, як спуджаныя авечкі. Кручкаватыя пальцы ад натрывычкі пінграбла трымаюць шасьцігранны аловак. Палікар увесь нагруз у лісьціж чыстай паперы. Цяпер тут сабрана ўсё яго мастацтва ў рабоце, уся энэргія і запал. Палікар толькі тады паручае свой сакавой і пераводзіць дух, калі да «Круглі» прышыта апошняя літара «К»—«Круглік»—прачытвае Палікар напісаную мянюшку каня.

Брыгадзіры Юркаўскай фэрмы калгасу «Барацьбіт» сёньня разьбіраюць паміж брыгадамі цягавую сілу і сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Фралоў Восіп, старэйшы конюх, а цяпер брыгадзір трэцяй пастаянай палявой брыгады абавязкова хоча ўзяць сабе «Васіля», Палікар Пятроў і брыгадзір першай брыгады Апанас Галаўнёў спачатку не стаджаюцца. Тады нехта з праўленьня прапануе адчаць Восіпу «Васіля», але з дадаткам—разам са слабейшай кабылкай «Нежная». Брыгадзіры згаджаюцца і Фралоў запосіць у сваю запісную кніжачку дзьве новыя мянюшкі.

Коўчы калгасны конь мае сваё імя. Брыгадзіры напамяць ведаюць усіх коняй і іх мянюшку, але ў паасобных выпадках, калі завядзецца якая небудзь гарачая спрэчка, Палікар пытае:

— Гэта чый, Макараў ці што?

І старэйшы конюх Восіп цьвёрда адказа:

— Крычэўскага Мікіты, з Бранску...

Але гэта між іншым, для большай пэўнасьці, са спасылкаю на «старую памяць». Цягавая сіла разыменкавана. «Гузыр», «Малыш», «Круглік», «Лятуча», «Кулік», «Юрка», «Дзянікін», «Васіль». «Міленькі», «Буян», «Нежная» і дзесяткі іншых калгасных коняй перайшлі ў брыгады.

Першыя кропасьці ўзяты правільна. У пачатковыя дні сонечнага краса віка «Барацьбіт» стварыў цьвёрдыя вытворчыя брыгады.

На вытворчым вучастку брыгады Галаўнёва Апанаса павінна быць пасёена: 16 га бульбы, 11 га вікі, 12 га ільну, 21,5 га аўса і сіласных культур 2,5 га.

У брыгадзе—32 чал. Да яе прымацавана 17 коняй, 13 плугоў, 3 пары боран «Зыг-Заг», 11 звычайных боран, 11 калёс, 10 вазовых хамутоў і 14 ралейных.

Брыгада Палікара Пятрова будзе працаваць на вытворчым вучастку ў 103 га. Яму дана заданьне пасеяць: 20 га ячменю, 8,5 га канапель, 9 га грэчкі, 20 га вікі, 32 га бульбы, 3,5 га аўса, 10 га ільну. Брыгада атрымала: 17 коняй, 13 плугоў, 3 пары «Зыг-Заг», 11 звычайных боран, 10 калёс, 10 вазовых хамутоў і ралейных 13. Людзей у брыгадзе 28 чалавек.

У брыгадзе Фралова Восіпа 26 чалавек. Да яе прымацавана: 16 коняй, 12 плугоў, 3 «Зыг-Заг», 10 калёс, 10 вазовых хамутоў і 13 ралейных, 1 культыватар. Вытворчае заданьне: 34,7 га бульбы, 9 га ільну, 7,5 грэчкі.

Брыгада Пятрова Кузьмы—30 чалавек. Вытворчы вучастак 80,5 га.

Брыгада Малахава Рыгора—28 чалавек. Вытворчы вучастак—106 га.

Агародная брыгада Ткачова Цімоха—28 чал. Плошча—18 га.

Брыгадзіры ведаюць свае вытворчыя заданьні і перад выхадам у поле яшчэ раз правяраюць баявую гатоўнасьць свайго калгасу. Кожны разумее ўсю адказнасьць за атрыманае вытворчае заданьне і ўзбройвае брыгаду для лепшай работы.

На пробным выезьдзе падабралі да коняй хамуты і пранумаравалі іх. Хамуты вісяць на сьцяне ў стальмахавай пушы і цяпер брыгадзіры разьбіраюць іх (па нумарох сваіх коняй).

Сакратар праўленьня Чэмбар, калгаснік першай брыгады, бярэ ў рукі хамут і чытае на клыштыне:—37. У каго?

Брыгадзіры шукаюць у сваіх запісных кніжках трыццаць сёмы нумар.

Чэмбар зьнімае са сьцяны зусім новы ралейны хамут. У брыгадзіраў загараюцца вочы і яны ўжо самі пытаюць пра нумар. Сакратар пачытаў нумар зьверху ўніз, потым павярнуў хамут зьнізу ўверх і кажа: дзевяць, альбо... шэсьць.

— Вядома 9, у маёй брыгадзе,—узрадавана кажа Восіп.

— Не сьпяшы,—перабівае яго Апанас,—а можа і 6. Шосты нумар у маёй брыгадзе.

Палікар стаяў у баку і пальцам правяраў па сьпісаных радкох свае кніжкі.—А вы,—кажа ён падыходзячы да сакратара—праверце, дзе кропка стаіць...

Кропку шукалі ўсе разам. Маленькая, чорненькая стаяла яна, гэта рашаючая кропка з боку шасьцёркі. Спрэчны хамут пераходзіць у рукі Апанаса.

На вуснах брыгадзіраў і праўленцаў з-падпішка вынырнула цёплая ўхмылка. Яны, бязумоўна, думаюць цяпер пра Палікараву сьмякалістасьць і пра маленькую кропку.

— Няпрыкметная дробязь,—заўважае Чэмбар, а глядзі ты, калі к месцу пастаўлена—многа значыць. Так і ўсё...

— Ты кажаш дробязь,—дапаўняе сакратара брыгадзір Восіп,—гэта, брат, ня дробязь. А помніш, як летась няправільна станілі гэтыя кропкі з хвосьцікам у працадні. Колькі блытанасьці было. Ня ўпішаш кропкі з хвосьцікам і ня ведаеш—ці ў чалавека 3,5 ці цэлых 35 працадзён.

— Брыгадзіры разьбіралі па брыгадах калёсы, плугі, ворчыкі і з іх галоў доўга яшчэ ня выходзіла проста кропка і кропка з хвосьцікам—коска.

Калі пад поўдня брыгадзіры і праўленцы прышлі на другую Юркаўскую стайню, да іх далучылася яшчэ пекальні калгаснікаў. У «Барацьбіце» няшчасьце і пра яго гаворыць увесь калгас. Дзьве ночы таму назад адзін з лепшых коняй «Жаркі» лёг у стайню качацца, забіўся пад кармушку і ўвесь пакалечыўся. Моцна пабіў галаву. Ляжыць «Жаркі» на пасланай саломе, цяжка дыша, стогне, мутнымі вачыма глядзіць на людзей.

Натому калгаснаму вартаўніку Пілінаву праўленьне вынесла пакараньне—калі конь прападзе спагнаць 30 проц. кошту. Але хіба прычыпа ў вартаўніку? Хто канкрэтна вінават у тым, што «Жаркі» ў тэмпэратуры ляжыць на канюшні і змучанымі вачыма, як чалавек, просіць дапамогі?

Нізкарослы, рухавы, у фрэнчы з сівога саматканага сукна, калгаснік—бадняк Даніла Ламінскі, злосна кажа:

— Такога каня ўбуёдалі. У плузе ішоў нібы ўлегцах. А чаму?

Догляд дрэнны, палянаваліся са скроблам пахадзіць трохі. Быў-бы чысты—ня лёг-бы ў стайню качацца.

І Даніла Ламінскі правяраае пульс «Жаркага», асьцярожна падымае яго хворую галаву і з рук дае мятчэйшае сена.

Многія згаджаюцца, што «так ужо суджана гэтаму капю».

— Суджана. Якога чорта суджана? —зноў умешваецца ў гаворку Даніла. Хутчэй трэба перадаць коняй у брыгады. Вось што, тады гэтага ня будзе. Калі да мяне, ці на другога, трэцяга прымацуюць поўнага каня, я-ж сам не даем і, не дасплю, а за ім даглядаю.

Абязьлічка зьела «Жаркага» ў першыя дні палявых работ. Гэта яна дала права людзям абылкава даглядаць жывёлу. На полачцы стайні ляжаць скрэблы і шчоткі. Але конюхі іх не бяруць у рукі. Коні брудныя, абкарэлыя.

І Даніла, і Восіп, і Апанас і ўсе перадавыя калгаснікі абураны выпадкам з «Жаркім», хваробаю за страту. Выхад яны бачаць у калгаснай брыгадзе і ў ліквідацыі абязьлічкі. Гэтага моднага слова яны не пазываюць, але разумеюць усю яго сутнасьць сваім нутром.

— Дробязь угробіла каня,—кажа Палікар, выходзячы з канюшні, — кропка з хвосьцікам былі не па сваім месцы... Ня можа таго быць, каб так было ў брыгадзе. Кожны будзе ў адказе за каня.

... Кожная, здавалася-б пікчэмная дробязь, «калі яна к месцу» мае вялікае значэньне. Брыгадзір, вырасшы з калгаснага актыву, разумее гэта значэньне, глыбока заглядае ў сутнасьць, асвойвае дэталі справы. Пановаму працуе і глыбока разумее нашы новыя задачы. Гэта перамога калектывізацыі. Гэта выяўленьне росту і новых якасьцяй калгаснага селяніна. І сёньня брыгадзіры-ўдарнікі «Барацьбіт» са злосьцю сустракаюць і праводзяць халодныя дні. Гэта яны зрываюць іх пляны, перашкаджаюць раньняй сяўбе. Іх гліністыя вучасткі ніяк ня могуць высахнуць.

Новая калгасная брыгада, пабудаваная па вытворчым прынцыпе, парадкуецца з вялікімі прудкасьцямі. Калі добра ў «Барацьбіце», дык ня добра яшчэ на многіх калгасах.

Асобныя работнікі ў раёне лічаць, што колькі брыгад, столькі-ж і скажэньняў. Гэта бязумоўна голас ня наш, гэта яўна няправільна, яўны паклёп. Ёсьць рэчы другога парадку. Адсутнасьць бальшавіцкага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку райкалгасаюзу, МТС і іншых раённых арганізацый работай калгасаў прывяла ў радзе сельсаветаў да грубых скажэньняў у арганізацыі калгаснай працы. Ня ўсе раённыя работнікі, старшыні калгасаў і брыгадзіры да канца вывучылі і зразумелі пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-га і ЦК КП(б)Б ад 22 красавіка аб брыгадах.

У калгасе «Колас», Міхнёвіцкага сельсавету, стварылі 9 брыгад, па кожную культуру—асобную брыгаду. Пасеяў у красавіку ашаніцу і гуляй на здароўе аж да сенакосу. Тут «арганізатары» мужчын прызвалі ў кадравікі брыгад, а ўсіх жанчын залічылі ў «пераменны склад»—у рэзэрв пазсобнай сілы.

Па такім-жа прынцыпе арганізоўваліся брыгады і ў калгасе «Чырвоны партызан» гэтага самага сельсавету.

Старшыня калгасу «Калініна», Сакальніцкага сельсавету, тав. Кісялёў, вынайшоў другі спосаб... Ён стварыў пастаянных... брыгадзіраў і кожны дзень ім назначаецца новыя людзі.

«Пастаяннаму брыгадзіру» **Гуткову** 16 красавіка вызначылі 12 чалавек сяўбы. Праз дзень, 18-га красавіка, на поле выяжджалі зусім новыя людзі, па іншых конях.

У самым вялікім калгасе Бацьвінаўскага сельсавету, «На варце» паасобныя таварышы і ў прыватнасьці адказны работнік райкому партыі тав. Узулеўская ўхітрылася «падправіць» работу, праведзеную ў сакавіку вызяздной брыгадай «Зьвязды» сумесна з раённымі арганізацыямі.

Ранейшыя брыгады скасаваны. Пры арганізацыі новых кіраваліся прынцыпам тэрытарыяльнасьці. Раней была тут вёска Карэлаўка, а цяпер—3-я палявая брыгада. А ў брыгадзе—402 га яравога кліну, і 170 працаздольных калгаснікаў. Гэта вытворчая «брыгада-гігант» па мудраму савету Узулеўскай і агранома МТС Труханоўскага разьбіта на новыя «ўнутраныя брыгады» вузкай спэцыяльнасьці—плугавікі, баранавікі, сяўцы, возчыкі гною і г. д. Кожная такая брыгадка мае свайго брыгадзіра.

Брыгадзір усяе брыгады (раней загадчык гэтай-жа фэрмы) тав. **Смалякоў** кожны дзень дае «спэцыялізаваным» брыгадам новыя «вытворчыя заданьні», панае поўная абязьлічка цягавай сілы і зямельных вучасткаў.

21-га баранавалокі падвозілі... лес да сьвінарніка, а 22-га яны выехалі на агарод

Падпальшчыкі вайны ўзмацняюць праваканатарскую работу на КУЧ

Заява кіраўніка КУЧ—Рудога

БЭЙПІН, 23. Як паведамляюць з Харбіну, кіраўнік КУЧ Руды ў інтэрв'ю з карэспандэнтам агенцтва «Ангаста» заявіў, што чуткі аб сабатажы служачых КУЧ, які, нібы, выклікае спазьненьне цягнікоў, а таксама чуткі аб забастоўцы на КУЧ, якая, нібы рыхтуецца, што распаўсюджваюцца белагвардзейскімі і японскімі газэтамі ў Харбіне, — бязглуздыя і прасьледуюць яўна правакацыйныя мэты. Далей Руды адзначыў, што да гэтага часу ня было ніводнага выпадку невыкананьня служачымі КУЧ сваіх абавязкаў, у тым ліку і на ўсходняй лініі КУЧ, дзе ў сувязі з ваеннымі дзеяньнямі служачыя КУЧ знаходзяцца ў выключна цяжкіх умовах. Ня гледзячы на гэта, паводле слоў т. Рудога, служачыя застаюцца на сваіх мясцох, вядучы далей звычайную дзейнасьць.

Нарэшце тав. Руды ўказаў, што выпадкі спазьненьня цягнікоў і спыненьня руху па ўсходняй лініі КУЧ тлумачацца выключна ваеннымі дзеяньнямі японскіх войск у раёне ўсходняй лініі.

Пратэст савецкага консула

БЭЙПІН, 23. Як паведамляюць з Харбіну, савецкі генэральны консул **тав. Славуцкі** 20 красавіка запрасіў начальніка дыплёматычнага кіраўніцтва ў Харбіне адносна паведамленьня аб спыненьні выдачы віз на выезд у СССР савецкім грамадзянам. Тав. Славуцкі падкрэсьліў, што падобнае мерапрыемства накіравана супроць СССР і выкліча энэргічны пратэст.

Сёньня начальнік дыплёматычнага кіраўніцтва Шы ў інтэрв'ю з прадстаўнікамі газэт адзначыў, што ніякіх распараджэньняў на гэтым пытаньні афіцыяльнымі ўладамі ня было зроблена. У сувязі з гэтай заявай становіцца зусім ясна, што забарона выезду была ўведзена па распараджэньні японскіх дарадцаў. Сёньня выдача віз адноўлена.

Напады на савецкіх грамадзян

БЭЙПІН, 23. Паводле паведамленьняў з Харбіну, апошнія дні групамі белагвардзейскай моладзі зьбіты два супрацоўнікі канцылярыі савецкага консульства, а таксама зроблен напад на кватэру служачых КУЧ. Савецкі генэральны консул у Харбіне **тав. Славуцкі** заявіў пратэст уладам, указаўшы, што няпрыняцьце мер у адно сінах да ўжо адзначаных выпадкаў бясчынстваў і свавольля белагвардзейцаў стварае спрыяючую абстаноўку для далейшых бясчынстваў і гвалтаў над савецкай калёніяй. Тав. Славуцкі патрабаваў самага строгага расьсьледваньня і прыняцьця адпаведных мер.

СССР і манчжурская дзяржава

БЭЙПІН, 23. Як паведамляюць з Харбіну, начальнік дыплёматычнага кіраўніцтва ў Харбіне на прыёме журналістаў заявіў, што манчжурская дзяржава не атрымала ніякіх заяў ад савецкага ўраду адносна прызнаньня манчжурскай дзяржавы.

Правакацыі ня спыняюцца

БЭЙПІН, 23. Паводле паведамленьня з Харбіну, харбінскія белагвардзейскія газэты ў сувязі з правалам правакацыйнай кампаніі аб так званай «усеагульнай забастоўцы служачых КУЧ» прабуюць выйсьці з канфузу, публікуючы «смехотворные» паведамленьні, нібы «забастоўка папярэджана, дзякуючы пільнасьці ўлад».

Да становішча на КУЧ

БЭЙПІН, 23. Сёньня ў сувязі з заняцьцем партызанскімі атрадамі станцыі Санчахэ, на паўднёвай лініі КУЧ рух спынен. Японскія самалёты бамбардуюць партызанскія атрады. На ўсходняй лініі КУЧ рух усё яшчэ не адноўлен у сувязі з ваеннымі дзеяньнямі, якія ўсё яшчэ адбываюцца далей. Тэлеграфная сувязь з усходняй лініяй і Уладывастокам перарвана.

Японцы пасылаюць войскі для барацьбы з Лі Хай-цзінам

ТОКІЁ, 24. Агенцтва Сімбун Рэнга з Чаньчуня паведамляе, што ахова паўднёва - манчжурскай дарогі паслала атрад на станцыю Саньчахэ для барацьбы з войскамі Лі Хай-цзіна. 23 красавіка японскія самалёты бамбардыравалі войскі Лі Хай-цзіна ў раёне станцыі Таолайджао на паўднёвым вучастку КУЧ.

Спробы ўзрыву маста праз Муданьцзян

БЭЙПІН, 23. ЯК паведамляюць з Харбіну, 23 красавіка кітайскай ахоўнай і агентамі КУЧ выкрыта спроба ўзрыву маста праз раку Муданьцзян на ўсходняй лініі КУЧ. Затрыманы два кітайцы.

ЦК КП(б)Б—тав. Гікало, СНК—тав. Галадзеду, Наркамзем—тав. Рачыцкаму

Перавыконваючы плянавыя заданьні, рабочыя, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал Беларускай канторы Саюзсельэлектра дабіліся новых перамог на фронце электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Да 1 мая электрыфікаваны ў Віцебскім, Аршанскім, Магілеўскім і Шклоўскім раёнах 5 саўгасаў, 15 калгасаў. У іншых раёнах — 5 МТС, 3 глыбінныя саўгасы. Агульная магутнасьць новых электрастанцый і падстанцый — 780 квт. Запэўняем, што на падставе 6 умоў тав. Сталіна плян 1932 году выканаем і перавыканаем.

ШПАК, ЦЯПЛІНСКІ.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Выкананьне прамфінпляну лёгкай прамысловасьцю БССР за 20 дзён красавіка

Паводле вестак наркамату лёгкай прамысловасьці, прадпрыемствы наркамату выканалі прамфінпляны за 20 дзён красавіка на 59,2 проц. Выпушча на прадукцыі на суму 18.525 тысяч р.

Лёгкая мэталяапрацоўчая прамысловасьць выканала праграму на 66,8 проц. — у тым ліку голкавая фабрыка — на 69,1 проц., завод «Камінтэрн» — на 60,6 проц. **Хэмічная прамысловасьць** выканала месячны плян за 20 дзён на 53,3 проц. у тым ліку «Чырвоны хэмік» — на 54,8 проц.; лякавы завод — на 18,7 проц., завод сухіх фарбаў — 55,4 проц., крэйдавы — на 101,9 проц.

Гарбарна - абутковая прамысловасьць выканала месячны плян за 20 дзён на 57,3 проц. Гарбарная прамысловасьць на 62,1 проц., у тым ліку гарбарня «Бальшавік» — на 70,1 проц., Віцебская гарбарня — 73,8 проц., гомельская гарбарня — на 65,8 проц., магілеўская — на 60,7 проц. і рымарная фабрыка — на 46,9 проц. Абутковая прамысловасьць выканала плян на 60,7 проц., у тым ліку менская абутковая — на 54,1 проц., віцебская абутковая — 53,1 проц., гомельская — 78 проц. і ФЗВ абутнікаў — 43,8 проц.

Шкляная прамысловасьць выканала месячны плян за 20 дзён на 63,6 проц., у тым ліку гута «Камінтэрн» дала 70,3 проц., імя Домбаля — 70,5 проц., «Кастрычнік» — 66,3 проц., «Ільіч» — 41,9 проц., «Пралетары» — 53,3 проц., «Ноўка» — 66,6 проц.

Тэкстыльная прамысловасьць выканала месячны плян за 20 дзён на 63,6 проц., у тым ліку ільнапрадзільная фабрыка «Дзьвіна» — на 47,6 проц., ільнапрадзільная імя К. Маркса — на 58,2 проц., дняпроўская фабрыка — на 67,7 проц., Якаўлевіцкая суконная фабрыка — на 39,6 проц., панчошны камбінат імя К. Цэткін — на 69,2 проц., панчошны камбінат «КІМ» — 73 проц.

Швэйная прамысловасьць выканала месячны плян за 20 дзён на 58 проц. у тым ліку швэйная фабрыка «Кастрычнік» — на 64,1 проц., «Сьляг індустрыялізацыі» — 58 проц., фабрыка «Прафінтэрн» — 61,3 проц., фабрыка «Камінтэрн» — 77,6 проц., імя Валадарскага — 60,8 проц., імя Дзяржынскага — 54,9 проц., імя Крупскай — 77,7 проц., імя 8 сакавіка — 59,1 проц., ФЗВ КІМ — 57,2 проц. і магілеўскі ФЗВ — 38,7 проц.

Друкарня імя Сталіна выканала плян на 62,9 проц. і шпалерная — на 60 проц.

На здымку: Мантаж жалезных кан струкцый марценаўскага цэху.

С.-г. машыны

Завод «Чырвоны мэталіст» за 22 красавіка выпусьціў 26 жмыхадрабілак — 162,5 проц. пляну, 30 карнарэзак, або 150 проц. пляну; 30 бульбакапалак — 100 проц. пляну і 8 бораноў «Зыгзаг» — 15,3 проц. Усяго заводзкі плян выканан на 115,1 проц.

Будматар'ялы

Лесазавод «Спартак» за 22 красавіка распілаваў 66 кбм сырцу, або 82,5 проц. пляну. 23 красавіка распілавана 101 кбм. сырцу — 126 проц. пляну. Бачарны цэх 22 красавіка выпусьціў 1.022 камплекты цэмэнтнай клёпкі, што складае 113,6 проц.

Паведамленьні

— Менскаркомам КП(б)Б пікэйнымі пёньня тавэрыцы выключаюцца для дакладу ў прыгарадныя сельсаветы ў дні сьвят 1-га мая: Пячонка — прыгарадны сельсавет, Рагунавіч — Бераўскі, Пабліка — Ратамскі, Замойскі — Нова-Дворскі, Бронштэйн — Астр.-Гарадок, Кісенжук — Карэлічанскі, Кукелка — Замастоцкі, Кісьліцкі — Абчакскі, Каламеец — Калядзінчанскі, Дабрыня — Самахвалавіцкі, Мацюкевіч — Падгайскі, Нерко — Гатаўскі, Шалкавец — Грычанскі, Мастітоў — Семяніцкі, Каструлёў — Строчыцкі, Мяжуеў — Кайкаўскі, Данілевіч — Папярнянскі, Фрыдман — Прасьцянецкі, Улазаў — Крупіцкі.

— **29-IV, у 6 гадз. веч., у памяшканьні БАН (рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай, вялікая заля) культпрап ЦК КП(б)Б склікае нараду, на якую павінны абавязкова зьявіцца рэктары, заг. навуковай часткі інстытутаў, выкладчыкі грамадзка-палітычных дысцыплін ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў гор. Менску, а таксама сакратары парт. і камсамольскіх ячэек ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў і загачыні аддзелаў кадраў Наркаматаў, якія маюць інстытуты і тэхнікумы. Парадак дня: абсьледваньне марксыцка-ленінскага выкладаньня ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах.**

ПАПРАЎКА

У карэспандэнцыі «Самаабавязацельствы Койданаўскага савету будуць выкананы» («Зьвязда», ад 26 красавіка) украліся памылкі. Трэба чытаць: «Калі ў перавыбарах 1930 г. іх удзел складаў 68 проц., дык цяпер гэты ўдзел узрос да 79 проц.».

У другім абзацы другой калёнкі трэба чытаць: «...Да раённага зьезду саветаў выканаць ня менш 50 проц. фінпляну другога кварталу».

Жалобны вечар, прысьвечаны памяці М. М. Пакроўскага

25-га красавіка ў доме Камасьветы адбыўся жалобны вечар, прысьвечаны памяці М. М. Пакроўскага. Вечар арганізаваны ЦВК, СНК, беларускай акадэміяй навук, таварыствам старых бальшавікоў, таварыствам гісторыкаў - марксыстаў, інстытутам гісторыі партыі, цэнтральным бюро навуковых працаўнікоў і інш.

Пры перапоўненай залі жалобнае пасяджэньне адкрывае сакратар ЦВК БССР тав. Гнілякевіч, які ў кароткіх рысах ахарактарызаваў жыцьцёвы шлях М. М. Пакроўскага.

З вялікім дакладам на тэму «М. М. Пакроўскі — рэвалюцыянер і вучоны» выступіў прэзыдэнт Беларускай акадэміі навук тав. **ГОРЫН.**

Дакладчык малюе Пакроўскага, галоўным чынам як асобу, якая злучае ў сябе палкага бальшавіка-ленінца і сусьветнага вучонага, марксыцкага гісторыка і рэвалюцыянера - практыка.

Для М. М. Пакроўскага, — гаворыць т. Горын, — вышэйшым прынцыпам у навуцы зьяўлялася ваяўнічая партыйнасьць, а вядучым мэтадам — дыялектычны матэрыялізм. Вось чаму ён з такой палкасьцю, уласьцівай толькі бальшавіку, заўсёды бязьлітасна выкрываў розныя буржуазныя і дробна - буржуазныя плыні ў гісторыяграфіі.

У канцы сваёй прамовы тав. Горын заклікае усіх навуковых працаўнікоў з такім - жа бальшавіцкім запалам, як М. М. Пакроўскі, бязьлітасна выкрываць усялякія чужыя клясава - варожыя ўплывы на тэарытычным фронце, асабліва ў БССР, дзе, у сілу гістарычных абставін, засталася яшчэ спрыяючая глеба для клясава - варожай дзейнасьці

Ад імя наркамасьветы з прамовай выступіў нам. наркома, акадэмік **Вальфсон.** Апошні спыніўся на вялізарнейшай ролі М. М. Пакроўскага у перабудове старой, буржуазна - славеснай школы ў школу савецкую, працоўную, школу палітэхнічную, у школу Маркса і Леніна.

Тав. Вальфсон паведаміў, што Наркамасьветы пастанавіў адзначыць памяць Пакроўскага назвай яго імем Магілеўскага пэдагагічнага інстытуту, рабфаку БДУ і лепшай паказальнай школы. Апрача гэтага вызначаны тры стыпэндыі імя Пакроўскага для лепшых ударнікаў - студэнтаў.

Ад Камвузу з прамовай выступіў тав. Агульнік, ад таварыства гісторыкаў - марксыстаў — тав Саевіч.

(Белта)

памяці М. М. Пакроўскага

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

КАНЧАТКОВЫЯ РЭЗУЛЬТАТЫ ВЫБАРАЎ У ПРУСКІ ЛЯНДТАГ

БЭРЛІН, 25. Канчатковыя разультаты выбараў у прускі ляндтаг наступныя:

НАЗВА ПАРТЫЙ	Лік галас. (у тыс.)	Лік мандат.	Выбары ў ляндтаг у 1928 г. (у тыс.)	Лік мандат.	Выбары ў райхстаг у 1930 г.
Кампартыя	2.820	56	2.307	56	3.141
Сац.-дэм.	5.675	93	5.465	137	4.989
Партыя цэнтру	3.974	68	2.670	71	3.158
Народная партыя	332	6	1.620	40	1.004
Гасп. партыя	191	2	850	21	803
Дзярж. партыя	331	2	839	21	681
Партыя народн. права	41	—	236	—	108
Ганаверск. партыя	63	1	187	5	306
Хрысьціянска-сацыял. партыя	255	2	—	—	509
Нямецкая нацыянальн. партыя	1.525	31	3.275	82	1.969
Ландфёльк	142	—	277	—	579
Нацыян.-сац.	8008	160	—	6	3.983
Социяліст. рабочая партыя	80	—	—	—	—

Выбарчы каэфіцыэнт павысіўся ў параўнаньні з 1928 г.: тады для атрыманьня аднаго мандату патрабавалася 40 тыс. галасоў, у сучасны момант—**50 тыс. галасоў.**

РЭЗУЛЬТАТЫ ВЫБАРАЎ У ГАМБУРГУ, БАВАРЫІ, ВЮРТЭМБЭРГУ І АНГАЛЬЦЕ

БЭРЛІН, 25. Вынікі выбараў **у гамбурскі** парлямант паказваюцца ў наступным відзе: **камуністы** атрымалі **119.000** (на выбарах у парлямант 1931 г.—169.000, на выбарах у райхстаг 1930 г.—135.000) і **26 мандатаў** (36); **сацыял-дэмакраты — 226.000** (214.000, 241.000) і **49 мандатаў** (47); **нацыянал-сацыялісты—233.000** (202.000, 145.000) і **51 мандат** (43); **дзяржаўная партыя — 84.000** (67.000. 64.000) і **18 мандатаў** (14); **нацыяналісты — 32.000** (43.000 31.000) і **7 мандатаў** (9); народная партыя—**24.000** (37.000, 69.000) і **5** (7); **гаспадарчая партыя—5.000** (11.000, 17.000) і **1** (2); **хрысьціянска-сац.—8.000** (11.000, 12.000) і **1** (2); **сацыялістычная рабочая партыя—2.000** (0).

Вынікі выбараў **у баварскі** ляндтаг паказваюцца ў наступным выглядзе: **камуністы** атрымалі **259.000** галасоў (125.000, 224.000), **сацыял-дэмакраты — 604.000** (803.000, 788.000), **нацыянал-сацыялісты—1.271.000** (203.000, 677.000), **баварская народная партыя—1.272.000** (1.045.000, 711.000), **баварскі сялянскі саюз—253.000** (109.000), **народная партыя—26.000** (215.000, 74.000), **хрысьціянскія сацыялісты — 42.000** (44 тыс.), **сацыялістычная рабочая партыя—13.000** (0).

Мандаты **ў вюртэмбэрскім** ляндтагу размяркоўваюцца наступным чынам: **камуністы—7** (у 1928 г.—6), **сацыял-дэмакраты—14** (21), **партыя цэнтру—17** (18), **саюз сялян і вінадзелаў—9** (15), **дэмакраты—4** (8), **нацыяналісты—3** (4), **хрысьціянскія сацыялісты—3** (6), **партыя народнага права—0** (2), **нацыянал-сацыялісты—23** (1), народная партыя, народныя кансэрватары і гаспадарчая партыя не атрымалі ніводнага мандату (раней 4 мандаты).

Выбары **ў ангальтскі** ляндтаг прадстаўляюцца ў наступным выглядзе: **камуністы** атрымалі **3 мандаты** (на выбарах у ляндтаг у 1928 г.—3); **сацыял-дэмакраты—12** (15), **нацыяналісты—2** (2), **нацыянал-сацыялісты—15** (1), **партыя цэнтру—1** (0), **народная партыя—2** (6), **партыя дэмаўласьнікаў—1** (2), **дзяржаўная партыя—1** (2).

Турэцкая дэлегацыя прыбыла ў Адэсу

АДЭСА, 26 (Спэц. кар. ТАСС). Старшыня рады міністраў Турэцкай рэспублікі — Ісмэт-паша ў гутарцы са спэцыяльным карэспандэнтам ТАСС на борце параходу «Грузія» заявіў: «У момант, калі я падыходжу да берагу савецкай зямлі, дазвольце выказаць маю радасьць і шчасьце з поваду таго, што змагу асабіста ўвайсьці ў сувязь з вялікім прызным народам. СССР і Турцыю доўгія гады зьвязвае шчырая дружба. Я прыношу прывітаньне ня толькі ад сябе, але і ад турэцкага народу, які вельмі прыяцельскі адносіцца да савецкай краіны».

Бібліяграфія

Аб ролі пастуха

„Работа пастуха-жывёлавода ў саўгасах і калгасах"—аграном В. Н.Круглоў. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, 1931 г.

Поўная адсутнасьць літаратуры па кніжным рынку аб ролі і значэньні пастуха-жывёлавода гаворыць аб яўнай недаацэнцы з боку раду навукова-дасьледчых устаноў пастуха ў выраішэньні задач па разьвіцьці жывёлагадоўлі. Амаль што **першай спробай** зьяўляецца работа аграпома Круглова **паставіць** перад усёй масай рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і спэцыялістаў пытаньне аб тым, як зьберагчы і ўтрымаць жывёлу ў летні пэрыяд, аб значэньні пашы для жывёлы, аб відах пашы і аб ролі пастуха, як непасрэднага выканаўцы гэтых задач.

Аграном Круглоў у асноўным правільна паставіў і растлумачыў рад пытаньняў тахнічнага парадку аб утрыманьні жывёлы ў летні пэрыяд, падрыхтоўкі і скарыстаньні пашы і інш. Аднак, у рабоце Круглова дапушчан рад **блытаных, палітычна няправільных і шкодных** трактовак, якія павінны быць жорстка раскрытыкаваны.

Круглоў у першым разьдзеле—**«Роля пастуха на вёсцы ў пэрыяд яе калектывізацыі»,** характарызуючы пастуха дарэвалюцыйных часоў, падкрэсьлівае, што ранней работу пастуха разглядалі, як непатрабуючую ніякай кваліфікацыі і таму пасьба жывёлы даручалася **дэфэктыўным людзям як фізычна, так і разумова.** Круглоў асабліва падкрэсьлівае, што ў дарэвалюцыйны час сярод пастухоў амаль немагчыма было знайсьці пармальнага і здаровага чалавека.

А калі такі чалавек і сустракаўся, то ён **«быў ня менш дзікім, чым тая жывёла, якую ён пасьвіў».** Тут працягваецца знаёмая нам кулацкая «тэорыя». Гэта «тэорыя» была патрэбна кулаку, **каб апраўдаць** бязьмежную і бязьлітасную эксплёатацыю пастуха-батрака.

Праз некалькі старонак, дзе аўтар гаворыць аб ролі пастуха ў саўгасе і калгасе, мы пераконваемся, што па Круглову пастух і зараз—гэта **сацыяльная асаблівасьць, а не спэцыяльнасьць,** не кваліфікаваная работа па паляпшэньні жывёлы, дзе прадукцыйнасьці ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

Вось, што піша Круглоў аб удзеле пастуха ў агульных сходах, вытворчых нарадах саўгасаў і калгасаў і аб пастаноўцы там «пто» пытаньняў—пытаньняў пасьбы жывёлы:

«Тут трэба паставіць пытаньне па сваёй галіне, прасунуць, давесьці іх неабходнасьць, ЗРАБІЦЬ ІХ СУСТАЎНОЙ ЧАСТКАЙ ПЛЯНУ (падкрэслена аўтарам). Вось чаму трэба прыняць самы жывы ўдзел у рабоце агульных сходаў, дзе адбываецца абмеркаваньне і ўхваленьне пляну. Але гэтага мала. Трэба зацікавіць, прыцягнуць і выкарыстаць другія арганізацыі саўгасу і калгасу ў сваёй справе. Напрыклад, пачуў пастух, што камсамольская ячэйка на сваім пасяджэньні абмяркоўвае плян работы сваёй арганізацыі. Пастух з радасьцю будзе спатканы хлопцамі, калі ён запрапануе ім дадаць у іх плян якую-небудзь работу па паляпшэньні пасьбы жывёлы».

Гэта даволі вялікая вытрымка з брашуры аграпома Круглова паказвае, што аўтар у саўгасах і калгасах ставіць зусім асобна пастуха і пасьбу жывёлы, агараджае пастуха ад усяго калектыву і калектыў ад пастуха. Выходзіць, што пастух павінен толькі на сходах і вытворчых нарадах «да весьці неабходнасьць зрабіць сустаўной часткай пляну» саўгасаў і калгасаў работу па ўтрыманьні і догляду жывёлы ў летні пэрыяд.

З якога арсэналу ўзята тэорыя аб тым, што праблему жывёлагадоўлі, узьдым яе прадукцыйнасьці вырашае толькі пастух?...

Наступныя разьдзелы брашуры з усёй выразнасьцю паказваюць, што аўтар зусім не разумее тых сацыяльна-эканамічных зрухаў, якія адбыліся па вёсцы ў сувязі з ростам сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

У сваім дакладзе на VI зьезьдзе саветаў тав. Якаўлеў падкрэсьліў, **«калгасная гаспадарка разам з саўгаснай зусім зьмяняе твар нашай вёскі. Нават там, дзе калгасьнікі пакуль яшчэ ў меншасьці, яны ператвараюцца ў асноўную сілу вёскі. Калгасы вырасьлі ў сілу, якая стала ўсюды сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады».**

А Круглоў не адзін раз адзначае, што толькі **«яны** (пастухі—Т. М.) **зьяўляюцца апорай камуністычнай партыі, савецкай улады на вёсцы».** Круглоў не разумее таго, што ў выніку масавага росту саўгасаў і калгасаў і ліквідацыі кулацтва на базе суцэльнай калектывізацыі, у корані мяняюцца суадносіны клясаў і што **«ў адпаведнасьці з гэтым**—гаворыцца ў пастанове XIV зьезду УсеКП(б)—**па-новаму ставіцца пытаньне аб апоры савецкай улады на вёсцы».**

Далей аграном Круглоў разьвівае «тэорыю» аб трох шляхох разьвіцьця сельскай гаспадаркі:

«Першы з іх,—піша Круглоў,—гэта ад атрубаў і хутароў вярнуцца зноў да абшчыны з вузка-палосіцай, з межамі і межнікамі і іншымі вынікамі, якія з гэтага выцякаюць. Другі шлях, гэта шлях пабудовы буйнай сацыялістычнай гаспадаркі на падставе калектывізацыі. Існуе і трэці шлях, гэта шлях паглынаньня дробных атрубных і хутарскіх гаспадарак буйнымі капіталістычнага тыпу гаспадаркамі».

Прапаведнікам гэтай антыпартыйнай шкоднай «тэорыі» Круглоў выступае ня першым. Былі і раней спробы даказаць аб існаваньні трох шляхоў разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Аднак, партыя дала рашучы адпор, і выкрыла клясавую сутнасьць гэтых «тэорый», паказаўшы, што шляхоў разьвіцьця сельскай гаспадаркі **можа быць толькі два**—шлях капіталістычнага разьвіцьця і шлях сацыялістычнага.

«Мы стаім—гаварыў тав. **Сталін,—за гэты другі шлях. Пытаньне стаіць так: ці адзін шлях, ці другі, ці назад да капіталізму, ці наперад да сацыялізму. Ніякага трэцяга шляху няма і ня можа быць. Тэорыя роўнавагі ёсьць спроба вызначыць трэці шлях. І іменна таму, што яна разьлічана на трэці** (пісьпуючы) **шлях, яна зьяўляецца ўтапічнай, антымарксыцкай».**

Аўтар дапускае ня менш памылак і ў пытаньні арганізацыі і скарыстаньні пашаў.

Так, на старонцы 17 аўтар прыводзіць тры віды пашаў: часовыя, куды адносіць хоць і з агаворкамі пасьбу жывёлы на азіміні; пастаянныя пашы і пераменныя пашы, аб якіх між іншым гаворыцца:

«Пераменныя пашы—пашы, якія маюць вялікае значэньне і пасьба на якіх адбываецца два разы ў год. Напрыклад, сюды будуць належаць выганы, сенажаці, дзе пасуць жывёлу ад моманту яе выгану да так званай «забароны пасьбы на сенажацях»—20-25 мая і пасьля касьбы, а таксама дазволеная пясьніцтвам пасьба ў лесе, вучастках з пад пасеўных траў у полі і г. д.».

Аўтар забыў пра тое, што пастановамі ўраду рашуча забараняецца пана жывёлы на сенажацях вясной. Круглову няма ніякай справы да таго, што пана на сенажацях вясной значна зьніжае ўраджай сена і прыводзіць у нягоднасьць сенажаць у далейшым. Круглоў выключна выходзіць з таго, каб забясьпечыць жывёлу кармамі толькі ў летні пэрыяд.

На старонцы 18 Круглоў падкрэсьлівае, што ўсе «пастаянныя і пераменныя пашы, якія намі паказаны вышэй, бязумоўна павінны быць выкарыстаны саўгасамі і калгасамі з захаваньнем правільнай пашы на іх. Лепшымі з іх зьяўляюцца пашы на заліўных сенажацях». Такім чынам, яшчэ раз падкрэсьліваецца думка аб прывядзеньні ў нягоднасьць сенажацяй.

Гэтыя палітычныя памылкі Круглова зьніжаюць значэньне і правільных паказаньняў аб тэхніцы догляду і пашы жывёлы, якія ёсьць у кніжцы і робяць кніжку няправільнай, шкоднай.

Т. Малочка.

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ ОПТЭ

АПЭР.-ЭКС. СЭКТАР ЦС „ОПТЭ" АРГАНІЗУЕ
ПАДАРОЖЖЫ ПА УСІХ РАЁНАХ СССР
ПА АБМЕНЕ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ
ПАМІЖ ПРАМЫСЛОВЫМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ, САЎГАСАМІ, КАЛГАСАМІ МТС І МТС
І па вывучэньні сац. будаўніцтва і краязнаўства.
Турыстам прадастаўляецца льготны чыгуначны (водны) праезд, харчаваньне, інтэрнат, культабслугоўваньне.
Запрос даведак у краявых, абласных саветах „ОПТЭ".
Падрабязнасьці ў спэцыяльных праспэктах і даведніках.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ —
паводле тэмы А. БАРБЮС
ЗДАНЬ, ЯКАЯ НЕ ЗВАРАЧАЕЦЦА
Драма ў 8 частках
У ГАЛ. РОЛЯХ: О. ЖЫЗЬНЕВА І Б. ФЭРДЫНАНДАЎ.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — МАСТАЦКІ САВЕЦКІ ФІЛЬМ ЧОРНАЯ СКУРА драма ў 6 част. кіно-хроніка „За Сац. Беларусь".
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Мастацкі фільм вытворч. УСОДКІНО ІГДЭНБУ
СПАРТАК Пачатак: 7 г., 8-15, 9-30, 10-45 — Замежны фільм НАЧНЫ КРЫК; Звыш праграмы Навука і тэхніка у 1 ч.

Гаркомам, райкомам і ячэйкам МОПР'у БССР.
Для правядзеньня скарбонячнага збору ў першамайскія дні на вакрэсьць політэмігрантаў капіталістычных краін усім гарсаветам і раёнкомам МОПРу паслана поштай усё неабходнае. У гарадох МОПРу — ці ў гарсаветах — жкам ЖО і г. д. — і ў сельскіх мясцовасьцях — праводзіць сэмі ГК-ГК МОПРу.
Пры перасылцы грошай, сабраных у першамайскія дні, у пераводах указваць «першамайскі збор».
ЦК МОПР'у БССР.

28|V, у 7 гадз. веч. у памяшканьні клюбу харчавікоў (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай)
— аддбуксцца —
ЗЬЛЁТ КУЛЬТАРМЕЙЦАЎ
разам з нявісьменнымі, скончыўшымі ліквпункты,
З ПАРАДКАМ ДНЯ:
1) Падвядзеньне вынікаў ліквбезпрацы га г. Менску.
2) Прэміяваньне лепшых культармейцаў і нявісьменных.
3) Мастацкая частка. Запрашаюцца усе культармейцы і нявісьменныя.
Гарпрафсавет Гаранэ.

МЕНСКІ архітэктурна-будаўнічы тэхнікум
АБВЯШЧАЕ
веснавы набор
на аддзяленьні камунальнага будаўніцтва (Жылбуд, Апалбуд і Водаканалбуд) у ліку 90 асоб.
Прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-годкі.
Заявы прымаюцца з 15-красавіка па 5 мая.
Да заявы прыкладваюцца наступныя дакументы: 1) анкета, засьведчаная сав. ці праф. арганізацыяй, 2) дакумант аб узросьце, 3) аб адукацыі 4) аб сав. і матар'яльн. становішчы паступаючага і яго бацькоў, для калгасьнікаў—даведка аб часе ўступленьня ў калгас; для саматужнікаў—даведка аб падатку, 5) даведка аб праве голасу, 6) аб стане здароўя, 7) аб адносінах да вайсковай павіннасьці, 8) дзьве фатаграфічныя карткі і паштовых марак на 30 кап. для адказу.
Заявы накіроўваць па адрасе: г. Менск, вул. Карла Маркса, 37, Менскаму архітэктурна-будаўнічаму тэхнікуму.
Аб пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна.
ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМУ.

МЕНЦЭРАБКОП
паведамляе ўсіх зацікаўленых асоб і ўстаноў, што
З ПРЫЧЫНЫ ПЕРАДАЧЫ ПЛОДАГАРОДНАЙ базы МЦРК ПЛОДАГАРОДНАМУ ТРЭСТУ
пры Белаапплодагародніне, УСЕ ПРЭТЭНЗІІ — будуць прымацца — ТОЛЬКІ ДА 8 МАЯ
1932 г. непасрэдна базай МЦРК па адрасе: вул. Розы Люксэмбург, база МЦРК.
Менцэрабкоп.

Пры Менскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме (былы палітэхнікум)
АДКРЫВАЮЦЦА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ Ў ТЭХНІКУМ
Для рабочых (без адрыву ад вытворчасьці).
Курсы разлічаны на 4 месяцы.
На курсы прымаюцца рабочыя непасрэдна з вытворчасьці, якія маюць ня менш 2-гадовага рабочага стажу і адукацыю ня ніжэй 5 клясаў сямігодкі.
Па скончаньні курсаў слухачы залічваюцца ў архітэктурна-будаўнічы тэхнікум.
Заявы, анкеты, даведкі аб вытворчым стажы і пуцёўкі ад фабкому прымаюцца ў канцылярыі тэхнікуму (вул. Карла Маркса, 37) **да 15 мая.**
ДЫРЭКЦЫЯ.

Н. К. А. З. Б, МЕНГАРЗДРАЎ І ГАРПРАФСАВЕТ арганізуюць
Рабочы Санітарны Унівэрсытэт.
Задачы Унівэрсытэту:
Унівэрсытэт ставіць перад сабой задачу ўнядрэньня санітарнай культуры ў шырокія масы рабочых, падрыхтоўку кадраў актыву аховы здароўя — санкультармейцаў.
Курс абучэньня на факультэце — пяцігодка. Заняткі праводзяцца 2 разы ў шасьцідзённку (у гадзіны, вольныя ад працы).
Парадак прыёму:
Кадры студэнтаў камплектуюцца з асоб, накіроўваемых фабрыкамі, заводамі і ўстановамі па пуцёўках прафарганізацыі.
Студэнтамі Унівэрсытэту могуць быць асобы з 16-гадовага ўзросту.
Для паступленьня не патрабуецца скончэньня сярэдняй або нізшай школы.
Прыём заяў да 30 красавіка 1932 г. у ДОМЕ САНІТАРНАЕ АСЬВЕТЫ (пл. Волі 23-2 з 2-х да 8 гз веч., тэл. 10-60).

З 1 па 15 мая абвяшчаецца
рэгістрацыя ўсіх кіно-ўстановак
як стацыянарнага, так і перасовачнага тыпу.
Усе арганізацыі, у якіх ёсьць апаратура, павінны атрымаць блянкі рэгістрацыі ў аддзяленьнях БДК (Менск, Бабруйск, Ворша, Віцебск, Гомель) і прадставіць іх туды да 15-V-32 г.
Усе кіно-ўстаноўкі, якія да 15 мая ня будуць узяты на вучот, **забясьпечваецца карцінамі ня будуць.**
Рэгістрацыі падлягаюць усе кіно-ўстаноўкі якія дзейнічаюць, а таксама і тыя, якія бязьдзейнічаюць.
Белдзяржкіно.

З 1 красавіка 1932 г.
ПАЧАЛО СВАЮ ПРАЦУ
НОВА-АРГАНІЗАВАНАЕ
пры народным камісарыяце лёгкай прамысловасьці
НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР.
Адрас: Менск, пляц Волі, 21 (2-гі паверх)

Шукаю кватэру або пакой плата па згодзе
— Паведаміць: Школьная, 6, кв. 17, РОСІН

Менск, друкарня «Зьвязды».

Галоўлітбел № 337.